Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

31 САКАВІКА 2007 г.
СУБОТА

№ 61 (25926)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

«ЗБЯРЫЦЕ СВЯТА І З ВЕСЯЛОСЦЮ ПРЫЙДЗІЦЕ...»

Застаўся тыдзень да Вялікадня. Гэта будуць незвычайныя дні — Тыдзень Пакут Гасподніх. І ў Праваслаўнай царкве, і ў Касцёле адбудуцца асаблівыя службы, святары апрануцца ў асаблівыя строі. І дзіўным чынам перапляцецца ў сэрцах людзей боль і радасць, цярпенне і хвала.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сёння, у суботу, вернікі ўзгадваюць вялікі цуд, які зрабіў Гасподзь, — уваскрэсенне Лазара, які ўжо чатыры дні знаходзіўся ў труне. Многія з тых, хто былі сведкамі гэтага цуду, паверылі ў Сапраўднага Бога і чакалі Яго ў Іерусаліме да свята Вялікадня.

Заўтра, у нядзелю, хрысціяне будуць святкаваць Уваход Гасподні ў Іерусалім. Мы будзем узгадваць евангельскую падзею, калі Ісус Хрыстос прыйшоў у галоўны горад старажытнай Палесціны, каб добраахвотна перанесці пакуты і смерць на Крыжы. Як пішуць евангелісты, людзі з натоўпу, якія віталі Хрыста пры Яго ўрачыстым уваходзе, слалі на дарозе свае вопраткі, а таксама аліўкавыя і пальмавыя галінкі, усклікаючы пры гэтым: «Асанна ў вышніх! Блаславённы Той, Хто прыходзіць у імя Гасподняе!» Вось чаму ў апошнюю нядзелю Вялікага Посту здаўна існаваў звычай прыходзіць у храм з вярбой, якая на славянскіх землях квітнела — пакланялася Богу — раней за астатнія дрэвы. Таму і свята называецца Вербнай (Пальмовай — у католікаў) нядзеляй, у народзе — Вербніца.

Галінкам вярбы, асвячоным у храме на свята Уваходу Гасподняга ў Іерусалім, народ надае гаючую ўласцівасць. У некаторых мясцінах, віншуючы з Вербніцай, «сцёбаюць» адзін аднаго асвячонымі галінкамі, зычачы здароўя. Галінкі на працягу года захоўваюць дома, імі ўпрыгожваюць абразы. Леташнія галінкі саступаюць месца новым, але іх нельга выкідваць (яны асвячоныя!), трэба спаліць і попел высыпаць у чыстым месцы. Католікі гэтым попелам пасыпаюць галаву ў Папяльцовую сераду напярэдадні Вялікага посту.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Дарагія суайчыннікі-беларусы і браты-расіяне!

2 красавіка 1996 года, Дзень падпісання Дагавора аб беларуска-расійскай Супольнасці, па праву пазначаны ў календары як агульнае свята нашых народаў і стала для абедзвюх дзяржаў кропкай адліку новага шляху.

У гэтыя гады адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй дынамічна развіваліся па ўсіх накірунках. Аб'ём узаемнага гандлю павялічыўся ў чатыры разы і дасягнуў амаль 20 млрд долараў. Павысілася эфектыўнасць рэалізацыі сумесных праграм, накіраваных на вырашэнне сацыяльна-эканамічных задач, паглыбленне вытворчай кааперацыі. Распрацаваны і ажыццяўляецца механізм узаемнай абароны і прасоўвання інтарэсаў нашых краін на міжнароднай арэне, захавана і шматразова ўзмоцнена адзіная абаронная прастора, актыўна развіваецца ўзаемадзеянне ў праваахоўнай сферы.

Паслядоўнасць стратэгічнага партнёрства Беларусі і Расіі адпавядае гістарычнаму выбару двух брацкіх народаў і садзейнічае дасягненню галоўнай мэты яднання — павышэнню ўзроўню іх жыцця. Адбыліся сур'ёзныя зрухі ў забеспячэнні роўных правоў грамадзян абедзвюх краін. Пашыраецца гуманітарны абмен, больш сардэчнымі становяцца паўсядзённыя зносіны беларусаў і расіян.

Усім нам відавочна: аб'ектыўная неабходнасць збліжэння Беларусі і Расіі з гадамі становіцца ўсё больш адчувальнай. Сумесныя крокі ў будучыню патрабуюць ад іх кіраўнікоў дакладных, скаардынаваных дзеянняў, настойлівага пошуку аптымальных варыянтаў уліку нацыянальных інтарэсаў на аснове раўнапраўя і захавання суверэнітэту дзвюх дзяржаў.

Мы не маем права зніжаць тэмпы фарміравання адзінай эканамічнай прасторы, мытнага саюза, свабоднага рынку працы, агульнага інфармацыйнага, адукацыйнага і культурнага асяроддзя. Толькі выверanыя, узгодненыя ўзаемавыгадныя рашэнні адкрыюць новыя рэальныя магчымасці для пад'ёму нацыянальных эканомік, адраджэння палітычнай магутнасці, стварэння годнай будучыні нашым нашчадкам.

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас з гэтым светлым святам — Днём яднання народаў Беларусі і Расіі.

Моцнага вам здароўя, шчасця, міру і дабрабыту.

Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЁСЦЬ У ВЁСКІ БУДУЧЫНЯ!

Жыхары вёскі Белае Балота Рэчыцкага раёна (злева направа): Алена ВАРАНЦОВА з дачкой Янай, Дзіма ЧЫМЫРТАН з братам Ігарам і Сняжана СТАСЬКО з дачкой Дар'яй.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ МАГЧЫМЫЯ МОКРЫ СНЕГ І ЗАМАРАЗКІ

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава, характар надвор'я ў выхадныя істотна не зменіцца. У суботу да нас пачне рухацца атмасферны фронт з поўначы, стане больш воблачна, але ўдзень будзе даволі цёпла — 10—16 градусаў.

У першы дзень красавіка будзе сонечна і суха: тэмпература паветра ўначы ўсталюецца ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, удзень — 8—14 цяпла. Цёплае і сухое надвор'е захаваецца і ў панядзелак. Тэмпературны фон уначы мінус 3—плюс 3 градусы, удзень — 10—15 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі сіноптыкаў, з аўторка ў краіне істотна пахаладае. Тэмпература паветра ўначы — ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, удзень — 4—10 цяпла. У найбольш халодныя дні тыдня (магчыма, гэта будзе серада і чацвер) дождж будзе ісці ў чаргаванні з мокрым снегам. Тэмпература паветра ўначы можа дасягаць 2—7 марозу, а ўдзень толькі 1—6 цяпла. Сіноптыкі лічаць, што такія пахаладанні ў красавіку сустракаюцца даволі часта.

Сяргей КУРКАЧ.

У ЦЭНТРЫ ПАРЫЖА АДКРЫТА ПАМЯТНАЯ ДОШКА Ў ГОНАР НАПАЛЕОНА ОРДЫ

У цэнтры Парыжа, недалёка ад Апера Гарнье, адкрыта памятная дошка ў гонар Напалеона Орды. Гэта падзея адбылася ў рамках праведзеных у французскай сталіцы юбілейных мерапрыемстваў, прымеркаваных да 200-годдзя з дня нараджэння Напалеона Орды, паведамілі **БЕЛТА** ў прэс-службе Міністэрства замежных спраў.

Як падкрэслілі ў знешнепалітычным ведамстве, адкрыццё памятнай дошкі стала вынікам сур'ёзнай падрыхтоўчай работы, у выніку якой юбілей быў унесены ў Спіс памятных дат, у святкаванні якіх прымае ўдзел ЮНЕСКО.

У МІНСКУ ВЫКЛЮЧЫЛІ АЦЯПЛЕННЕ Ў АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ БУДЫНКАХ

Адпаведнае распараджэнне падпісаў старшыня Мінгарвыканкама Міхаіл Паўлаў.

Згодна з дакументам, у сувязі са спрыяльнымі ўмовамі надвор'я ад падачы цяпла адключаны адміністрацыйныя і вытворчыя будынкі, акрамя будынкаў архіваў, музеяў, тэатраў, бібліятэк і лазняў.

Кар. БЕЛТА.

У БЕЛАРУСІ НАЛІЧВАЕЦЦА НЕ МЕНШ ЗА 7—10 ТЫС. ДОЛАРАВЫХ МІЛЬЯНЕРАЎ

Такія даныя прывёў старшыня праўлення ААТ «Пріорбанк» Сяргей Касцючэнка на пасяджэнні Кансультатыўнага савета па замежных інвестыцыях пры Савеце Міністраў Беларусі.

Гэтыя сродкі можна эфектыўна выкарыстоўваць для развіцця эканомікі краіны. Паводле ацэнкі Сяргея Касцючэнкі, у Маскве колькасць такіх мільянераў дасягае 88 тыс., ва Украіне — 50—70 тыс. Такая нязначная колькасць мільянераў у Беларусі стрымлівае інвестыцыйную дзейнасць у краіне. Ён лічыць, што ў рэспубліцы існуе значны патэнцыял для далейшага развіцця фінансавага рынку. У першую чаргу для гэтага неабходна развіваць страхавы рынак, укараняць альтэрнатыўныя крыніцы пенсійнага страхавання, актывізаваць фондавы рынак, павялічыць прыток замежных інвестыцый.

Людміла САЦ, БЕЛТА.

АДВАКАТУ СПАТРЭБІЦЦА АДВАКАТ

Пракуратурай Мінскай вобласці ўзбуджана крымінальная справа супраць сталічнага адваката, які падазраецца ў хабарніцтве.

Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, адвакат быў затрыманы супрацоўнікамі службы па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ў момант атрымання хабару ў памеры 1650 долараў ад жыхара Заслаўя, які чакаў вынясення прыгавору судом Савецкага раёна сталіцы. Гэтыя грошы нібыта прызначаліся для «ўлагоджвання» службовых асобаў памянёнага суда, каб яны паспрыялі змякчэнню пакарання.

Дарэчы, як высветлілася, напачатку сакавіка адвакат падбухторваў гэтага ж жыхара Заслаўя перадаць у якасці хабару «патрэбнаму чалавеку» французскія духі коштам 187 тысяч рублёў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

З болем

БЕЛАРУСЫ ВЯРНУЛІСЯ ДАДОМУ

29 сакавіка 10 грамадзян Беларусі, якія знаходзіліся ў сталіцы Самалі Магадзіша, а таксама целы беларусаў, загінулых 23 сакавіка ў гэтай краіне ў выніку авіякатастрофы самалёта Іл-76 авіякампаніі «Трансавіяэкспарт», пад ваенным канвоем міратворчага кантынгенту Афрыканскага саюза былі дастаўлены на аэрадром ваенnай базы ў Самалі, якая знаходзіцца прыкладна за 100 кіламетраў ад Магадзіша. Адтуль у той жа дзень самалёт з беларусамі і целамі загінулых вылецеў у Аб'яднаныя Арабскія Эміраты.

Як паведамілі ў Міністэрстве замежных спраў нашай краіны, дастаўка беларусаў на аэрадром ваеннай базы стала вынікам сумеснай аперацыі ваенных Самалі, Эфіопіі і Уганды. Вечарам 29 сакавіка з ваеннай базы беларусы вылецелі ў ААЭ на самалёце расійскай авіякампаніі. Раніцай 30 сакавіка самалёт прызямліўся ў эміраце Фуджэйра (ААЭ). Як адзначылі ў МЗС, самалёт сустракалі паўнамоцны прадстаўнік авіяцыйных уладаў Беларусі, супрацоўнікі пасольства нашай краіны ў ААЭ, прадстаўнікі ўладаў ААЭ, прадстаўнікі Чырвонага Крыжа, медыкі і інш. Стан беларусаў пасля прызямлення аказаўся здавальняючым. «Яны адмовіліся ад медыцынскай дапамогі», — паведамілі ў МЗС Беларусі.

Пасля завяршэння ўсіх фармальных працэдур у 9 гадзін раніцы (па мінскім часе) 10 грамадзян нашай краіны і целы загінулых вылецелі з ААЭ ў Беларусь чартарным рэйсам на самалёце АН-12 беларускай авіякампаніі «Гомельавія». У МЗС дадалі, што праведзеная аперацыя стала вынікам прапрацоўкі розных варыянтаў эвакуацыі беларускіх грамадзян «з прыцягненнем урадаў Самалі, Эфіопіі, Уганды, сакратарыята Афрыканскага саюза і яго міратворчага кантынгенту, дэпартамента бяспекі Савета Бяспекі ААН, авіякампаній шэрагу дзяржаў».

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

САЮЗНАЕ БУДАЎНІЦТВА: ПАВОЛЬНА, АЛЕ НАДЗЕЙНА?

Другога красавіка будзе адзначацца Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі. Гэты саюзны год быў адным з самых неадназначных у гісторыі ўзаемаадносінаў дзвюх краін пасля падпісання дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. З пытаннем аб плюсах і мінусах саюзнага года «Звязда» звярнулася да беларускіх палітыкаў.

Вадзім ПАПОЎ, старшыня камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі:

— Станоўчая або негатыўная ацэнка падзеі залежыць ад таго, што чалавек хоча ў ёй бачыць. А больш у годзе было практычнай працы. Было падпісана пяць вельмі важных пагадненняў: аб роўных правах на знаходжанне і жыхарства на тэрыторыі краін, аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння, аб парадку аказання медыцынскай дапамогі ва ўстановах аховы здароўя Беларусі і Расіі, аб рэгуляванні пытанняў уласнасці Саюзнай дзяржавы, аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання. Цяпер яны праходзяць унутрыдзяржаўныя працэдуры, якія дазволяць ім дзейнічаць у інтарэсах грамадзян Беларусі і Расіі. Дарэчы, па 4 з іх Беларусь выканала свае працэдуры, а па пагадненню аб саюзнай уласнасці завяршаецца распрацоўка механізма яе ўліку. Гэтыя крокі ў саюзных адносінах неадацэньваць нельга. Актыўна рэалізуюцца эканамічныя саюзныя праграмы. У снежні прыняты саюзны бюджэт на гэты год, які дасягае 4 млрд расійскіх рублёў. Усё гэта элементы, якія можна аднесіць да плюсавых.

Абвастрэнне ва ўзаемаадносінах, якое пачало назірацца некалькі месяцаў назад у сувязі са зменаннем цэнавай палітыкі на энерганосьбіты, зразумела, выклікала негатыўную рэакцыю ў грамадзян Беларусі і Расіі. Але гэтыя складанасці пераадольваюцца. 23 сакавіка на пасяджэнні саюзнага ўрада падпісана пагадненне аб развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, аб пастаўках цукру на гэты і наступны гады, пратаколы аб прынцыпах збірання ўскосных падаткаў ва ўзаемным гандлі.

Таксама можна ўзгадаць і тое, што ўрад Расіі разглядае прапанову Беларусі аб выдзяленні стабілізацыйнага крэдыту ў сувязі з павышэннем цэнаў на энерганосьбіты. Як бачна, і ў гэтай частцы ёсць рух наперад. Падрыхтоўка шэрагу пагадненняў у рамках дагавора аб калектыўнай бяспецы, аб адзінай сістэме проціпаветранай абароны, аб далейшым абсталяванні саюзнай мяжы гаворыць, што хоць і няпросты, але рух на пабудову Саюзнай дзяржавы працягваецца. Дарэчы, саюзны ўрад таксама разгледзеў прапановы міністэрстваў і ведамстваў дзвюх краін аб праектах праграм будучага года. Думаю, мы будзем мець добрую перспектыву павелічэння саюзнага бюджэту ў наступным годзе.

Мікалай ЛАЗАВІК, сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў:

— Калі казаць аб яднанні народаў Беларусі і Расіі, то, лічу, гэты працэс ідзе паслядоўна, адлюстроўваючы рэальную волю народаў краін. Некаторы негатыўны адбітак на гэты рух нанеслі асобныя эканамічныя няўзгодненасці, якія ўзніклі на фоне праблем, што выкліканы хутчэй палітычнымі, а не эканамічнымі прычынамі з пастаўкай энерганосьбітаў.

Але, па вялікаму рахунку, гэтыя праблемы ніякім чынам не адлюстраваліся на накіраванасці руху народаў, якія заўсёды выступалі за яднанне. Што ж датычыцца саюзнага рэферэндуму, то ён прадугледжвае вынясенне на абмеркаванне нейкага дакумента, канкрэтнага пытання. Пакуль ён не сфарміраваны, казаць аб рэферэндуме рана.

Сяргей КАСЦЯН, намеснік старшыні камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі:

— Гэты год быў дастаткова неадназначным, бо, з аднаго боку, у краін назіралася імкненне працягваць працу па стварэнню Саюзнай дзяржавы, а з другога — Крэмль усякім чынам тарпедыраваў гэту працу. Калі браць пытанні палітычнага характару, то ўсё засталося на месцы без зменаў. Калі браць пытанні эканамічныя, то яны накіраваныя ў горшы бок і не садзейнічаюць далейшаму ўмацаванню Саюзнай дзяржавы. Калі разглядаць знешнепалітычныя пытанні, то на знешнепалітычнай арэне мы ідзём разам па ўсіх пытаннях, у нас прысутнічае поўная падтрымка і паразуменне. Але, на жаль, далейшая праца была азмрочаная аднабаковымі дзеяннямі Расіі ў галіне гандлёва-эканамічных узаемаадносінаў. Што рабіць? Думаю, гэта таксама можна з часам паправіць.

Цяпер у Расіі наступіў перыяд нявызначанасці, калі невядома, хто будзе праз паўтара года на ўладзе. У снежні гэтага года — думскія выбары, у сакавіку наступнага — прэзідэнцкія. Гэтыя паўтара года няпэўнасці накладваюць негатыўны адбітак на саюзныя адносіны. Пасля ж гэтага ўсё павінна наладзіцца. Таму цяпер можна казаць у большай ступені аб доўгатэрміновых перспектывах Саюзнай дзяржавы.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ, старшыня камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі:

— У гэтым годзе ў саюзных адносінах хапала як плюсаў, так і мінусаў. Нават не ведаю, чаго было больш. Жыццё заўсёды ідзе паласамі — белымі і чорнымі. У любым выпадку кожны крок, які адбываўся ў мінулым годзе (дрэнны — адносна газу і нафты, станоўчы — у частцы правядзення сумесных пасяджэнняў па вызначэнню далейшага курсу развіцця), прынёс нейкую рэальную карысць. Усё, што ні робіцца, вядзе да лепшага.

Перспектывы ў Саюзнай дзяржавы нармальныя. На любым этапе, калі робіцца нешта добрае, калі, кажучы вобразна, хлопец збіраецца ажаніцца, заўсёды знойдуцца людзі, якія скажуць аб ім дрэнна. Так і ў працэсе будаўніцтва Саюзнай дзяржавы: заўсёды знойдзецца той, хто выступіць супраць. Сувязі ж з Расіяй па-ранейшаму ўмацоўваюцца. Так, на пэўным этапе быў зрыў, але потым пайшоў рух наперад. У будаўніцтве Саюзнай дзяржавы тэмпы, напэўна, не такія, якія хацелася б, але само будаўніцтва ідзе.

Сяргей КАРАЛЕВІЧ.

«МЫ — РАЗАМ!»

Так называецца кніга вядомага беларускага журналіста і пісьменніка, лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», дырэктара РВУ «Літаратура і мастацтва» Алеся Карлюкевіча, прэс-прэзентацыя якой адбылася ў Грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы напярэдадні Дня яднання народаў Беларусі і Расіі.

Кніга выйшла пры падтрымцы Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы. У выданні сабраны гутаркі, нарысы, эсэ, большасць якіх былі апублікаваны ў сродках масавай інфармацыі Саюзнай дзяржавы. Аўтар уважліва сочыць за развіццём культуры і гісторыі Беларусі і Расіі, за лёсамі пісьменнікаў і мастакоў, акцёраў і навукоўцаў, людзей, імёны якіх аднолькава дарагія народам дзвюх краін.

Уладзя ТАЦЦЯНЧЫК.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СЕНАТ ЗША ПРЫНЯЎ ЗАКОН АБ ДАЦЕ ВЫВАДУ ВОЙСКАЎ З ІРАКА

Верхняя палата Кангрэса ЗША адобрыла законапраект, які ўвязвае прадаставленне дадатковых сродкаў на вайну ў Іраку з вызначэннем абавязковых тэрмінаў вываду амерыканскіх войскаў з гэтай краіны. У падтрымку дакумента прагаласавалі 51 сенатар, супраць выступілі 47.

Праект закона прадугледжвае выдаткаванне 121 мільярда долараў на вядзенне баявых дзеянняў у Афганістане і Іраку і адначасова ўстанаўлівае 31 сакавіка 2008 года ў якасці крайняга тэрміну вяртання амерыканскіх салдатаў з Ірака на радзіму. Для таго, каб закон уступіў у сілу, яго павінен падпісаць прэзідэнт краіны Джордж Буш. Аднак кіраўнік дзяржавы ўжо заявіў, што накладзе вета на любы законапраект, які будзе ўстанаўліваць крайні тэрмін знаходжання амерыканскіх войскаў у Іраку.

СПІКЕР САВЕТА ФЕДЭРАЦЫІ РФ ПРАПАНАВАЎ РАСІЙСКАМУ ПРЭЗІДЭНТУ З ПА 7

Сяргей Міронаў, абраны ўчора ў трэці раз старшынёй Савета Федэрацыі, прапанаваў унесці шэраг змяненняў у Канстытуцыю РФ, якія датычацца прэзідэнцкіх паўнамоцтваў. У прыватнасці, ён прапанаваў павялічыць тэрмін знаходжання на пасадзе прэзідэнта «да пяці, а можа быць, і сямі» гадоў.

Акрамя таго, сказаў Міронаў, размова вядзецца аб змяненні артыкула 81 Канстытуцыі РФ, у адпаведнасці з якім кіраўнік дзяржавы можа абірацца запар не больш чым на два тэрміны па чатыры гады. «Прапаную тры тэрміны», — дадаў Міронаў (максімум — 21 год. — **Аўт**.). У сувязі з гэтым спікер Савета Федэрацыі прапанаваў правесці на ўзроўні рэгіянальных парламентаў адпаведныя сходы і разгледзець прапановы па змяненню артыкула Канстытуцыі, звязанага з прэзідэнцкімі паўнамоцтвамі. «Па сутнасці гэта будзе ўсерасійская нарада па гэтых пытаннях», — сказаў спікер. «Канчатковае рашэнне будзе, канешне, за Уладзімірам Пуціным, можа быць ён прыслухаецца да голасу дэпутатаў», — сказаў Міронаў.

Першы віцэ-спікер Дзярждумы Любоў Сліска адобрыла ідэю Міронава. У той жа час старшыня Дзярждумы Барыс Грызлоў спікера СФ не падтрымаў. Паводле яго слоў, парламенцкая большасць «Адзінай Расіі» ў Дзяржаўнай Думе «будзе стаяць на варце дзеючай Канстытуцыі». Лідар КПРФ Генадзь Зюганаў лічыць, што Міронаў у выпадку з гэтай ініцыятывай выступаў толькі як мадэратар настрою пэўнай часткі «палітычнай вярхушкі».

АМЕРЫКАНЕЦ АДМОВІЎСЯ ВЫПЛАЧВАЦЬ АЛІМЕНТЫ БЫЛОЙ ЖОНЦЫ, ЯКАЯ СТАЛА МУЖЧЫНАМ

Суд адмовіўся вызваліць жыхара Фларыды ад выплаты аліментаў былой жонцы, якая змяніла пол пасля разводу.

На думку адвакатаў 48-гадовага Лоўрэнса Роўча, рашэнне яго 55-гадовай былой жонкі Джуліі Сільверфольф стаць мужчынам анулявала іх пагадненне аб скасаванні шлюбу. Адвакаты ўказваюць на тое, што ў ЗША аднаполыя шлюбы забаронены, а гэта, на іх думку, робіць незаконнай выплату аліментаў мужчынам мужчыну. Аднак гэтыя аргументы падаліся суду непераканаўчымі.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Уладзіміра Пуціна з Днём яднання народаў Беларусі і Расіі

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна з Днём яднання народаў Беларусі і Расіі, які адзначаецца 2 красавіка.

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць, што далейшае развіццё ўсебаковага беларуска-расійскага супрацоўніцтва адпавядае гістарычнаму выбару двух брацкіх народаў і садзейнічае дасягненню галоўнай мэты яднання — павышэнню ўзроўню іх жыцця. «Спадзяюся, намі будуць знойдзены эфектыўныя і ўзаемапрымальныя вырашэнні пытанняў беларуска-расійскай інтэграцыі на сучасным этапе», — адзначыў ён. Віншавальныя пасланні накіраваны Дзяржаўнаму сакратару Саюзнай дзяржавы Паўлу Барадзіну, Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Старшыні Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Барысу Грызлову, Старшыні Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, Старшыні Урада Расійскай Федэрацыі Міхаілу Фрадкову, іншым палітычным дзеячам Расійскай Федэрацыі, а таксама Патрыярху Маскоўскаму і ўсяе Русі Алексію II.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Мінгандаль павінен цесна ўзаемадзейнічаць з мясцовымі органамі ўлады ў вырашэнні пытанняў абслугоўвання насельніцтва

Міністэрства гандлю павінна больш цесна ўзаемадзейнічаць з мясцовымі органамі ўлады і своечасова вырашаць усе пытанні, што ўзнікаюць у гандлёвым і бытавым абслугоўванні насельніцтва. Такую задачу паставіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка перад міністрам гандлю Аляксандрам Іванковым.

Кіраўнік дзяржавы 30 сакавіка прыняў з дакладам кіраўніка Міністэрства гандлю. Прэзідэнт праінфармаваны аб выніках работы прадпрыемстваў гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання Мінгандлю за 2006 год і два месяцы гэтага года. Размова ішла таксама аб павышэнні эфектыўнасці гандлёвага і бытавога абслугоўвання насельніцтва. Аляксандр Іванкоў паведаміў, што выкананы і перавыкананы паказчыкі па аб'ёму рознічнага тавараабароту, аб'ёму аказаных бытавых паслуг насельніцтву, у тым ліку ў сельскай мясцовасці, эканоміі энергазатрат, росту заработнай платы ў галінах, інвестыцыях у асноўны капітал, скарачэнню складскіх запасаў. Міністр праінфармаваў Прэзідэнта аб ходзе выканання шэрагу задач Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі, якія знаходзяцца ў веданні міністэрства. У прыватнасці, цяпер аднаўляюцца і рамантуюцца каля 400 аб'ектаў гандлёвага і бытавога абслугоўвання насельніцтва ў вёсцы. Прэзідэнт запатрабаваў больш эфектыўна вырашаць пытанні стварэння тавараправодных сетак за межамі Беларусі. Размова ішла таксама аб тым, што патрэбны новыя, больш якасныя падыходы да работы гандлю ў сувязі з маючым адбыцца ўступленнем Расіі ў СГА.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі — свой сцяг

Адпаведным указам, падпісаным кіраўніком дзяржавы, зацвярджана таксама палажэнне аб сцягу, яго апісанне і відарыс.

Мэта гэтага рашэння — захаванне і прымнажэнне гістарычных традыцый службы штабоў ва Узброеных Сілах, выхаванне і натхненне ваеннаслужачых на ўзорнае выкананне свяшчэннага абавязку па абароне Айчыны, адзначылі ў прэс-службе.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У Беларусі выбудавана празрыстая схема інвесціравання

Аб гэтым паведаміў учора прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, адкрываючы чацвёртае пленарнае пасяджэнне Кансультатыўнага савета па замежных інвестыцыях пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Беларуская эканоміка ўстойлівая да ўплыву знешніх фактараў, у тым ліку да павышэння кошту на энергарэсурсы, адзначыў прэм'ер-міністр. Апошнім часам узрасла цікавасць замежных інвестараў да Беларусі. Гэта абумоўлена, у першую чаргу, стабільнасцю сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў краіне, наяўнасцю высокакваліфікаваных спецыялістаў у гэтай сферы. Разам з тым Сяргей Сідорскі прызнае існаванне ў краіне значных праблем, звязаных з рэзкім падаражэннем энерганосьбітаў. Аднак, нягледзячы на такія цяжкасці, задачы, якія ўрад ставіць перад рэальнай эканомікай, выконваюцца, падкрэсліў прэм'ер. Так, у Беларусі прыняты меры па інавацыйнаму развіццю дзяржавы, якія прадугледжваюць стварэнне больш як 100 новых высокатэхналагічных прадпрыемстваў, а таксама арганізацыю больш як 400 новых вытворчасцяў. Урад паставіў задачу максімальна прыцягваць у рэспубліку новыя тэхналогіі, у тым ліку на малыя і сярэднія прадпрыемствы. Такім чынам Беларусь паскорана правядзе мадэрнізацыю асноўных вытворчасцяў. У Дзяржаўнай праграме інавацыйнага развіцця Беларусі на 2007—2010 гады дакладна прапісаны канкрэтныя праекты, на рэалізацыю якіх плануецца прыцягваць інвестыцыі. «Такім чынам, мы адкрылі поле для бізнэсу. У Беларусі выбудавана празрыстая схема інвесціравання, і Беларусь прапануе інвестыцыйныя праекты ва ўсіх галінах эканомікі», — адзначыў Сяргей Сідорскі.

Людміла САЦ, БЕЛТА.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

2 красавіка 2007 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) пачне работу сёмая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Шостая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання пачне сваю работу 2 красавіка 2007 года ў 10 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала). Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 2 красавіка 2007 года з 8.30 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

ISSN 1990-763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.03.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 143,00
1 еўра	2 855,01
1 латвійскі лат	4024,04
1 літоўскі літ	826,62
1 чэшская крона	101,82
1 польскі злоты	738,60
1 расійскі рубель	82,39
1 украінская грыўня	426,64

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РБ

USD	26,0113
10 UAH	51,3966
1000 BYR	12,1237
EUR	34,6861

Курс у гандлёвых кампаніях (на 30.03.2007 г.)

USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісацца на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у радыусі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Аляксандр Лукашэнка ў бліжэйшы час наведае Венесуэлу

У бліжэйшы час плануецца афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Венесуэлу, а затым нашу краіну наведае прэзідэнт Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавес. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы, каментуючы вынікі рабочай сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з Дзяржаўным сакратаром Савета Бяспекі, сустаршынёй беларуска-венесуэльскай сумеснай камісіі высокага ўзроўню Віктарам Шэйманам.

Віктар Шэйман далажыў Прэзідэнту аб выніках візіту ўрадавай дэлегацыі Беларусі ў Венесуэлу.

У ходзе візіту падпісана ў агульнай колькасці 24 пагадненні, кантракты, мемарандумы. Заключаны кантракты па пастаўцы ў Венесуэлу беларускай тэхнікі, у тым ліку трактарнай, аўтамабільнай, аўтадарожнай, тэлевізіраў, халадзільнікаў, а таксама прадуктаў харчавання. Дасягнуты шэраг пагадненняў у галіне сельскай гаспадаркі, машынабудавання, у прыватнасці, прыняты рашэнні па стварэнню зборачных вытворчасцяў беларускай тэхнікі.

Па дамоўленасці з прэзідэнтам Уга Чавесам Венесуэла выдзяляе беларускаму боку ўчасткі для здабычы нафты з развітай інфраструктурай. Гэта дасць магчымасць, пачынаючы з 2008 года, здабываць не менш як 2 млн т нафты штогод.

Да жніўня 2007 года плануецца таксама стварыць сумеснае прадпрыемства па здабычы нафты ў Венесуэле.

Як было даложана кіраўніку беларускай дзяржавы, дасягнуты шэраг дамоўленасцяў у галіне будаўніцтва жылля як у самой сталіцы, так і ў рэгіёнах Венесуэлы. Прынята рашэнне і аб будаўніцтве беларускімі спецыялістамі цагельнага завода з аб'ёмам выпуску цэглы не менш як 100 млн штук у год, завода жалезабетонных вырабаў.

У Венесуэле абмяркоўваліся розныя напрамкі міжнароднага супрацоўніцтва. Як адзначыў Дзяржсакратар Савета Бяспекі, па большасці праблемных пытанняў міжнароднай палітыкі нашы пазіцыі супадаюць.

Кіраўнік дзяржавы таксама падкрэсліў, што ў беларускага боку склаліся самыя даверныя адносіны з венесуэльскімі калегамі па ўсіх пытаннях двухбаковага ўзаемадзеяння.

Кар. БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аптымальныя тэрміны пасадкі бульбы — з 11—15 красавіка

Нягледзячы на раннюю вясну, спяшацца з пасадкай бульбы сельгасарганізацыям Беларусі не варта. Аб гэтым паведаміў намеснік генеральнага дырэктара Навуковапрактычнага цэнтра НАН Беларусі па бульбаводству і плодаагародніцтву Мар'ян РУБЕЛЬ.

Аптымальныя тэрміны масавай пасадкі бульбы ў гэтым годзе надыходзяць з 11—15 красавіка.

Да 10 красавіка, паводле прагнозаў сіноптыкаў, чакаюцца начныя замаразкі да мінус 10 градусаў. Пры такой тэмпературы зямля прамярзае на глыбіню 5 см (прыкладна на такой глыбіні і знаходзяцца клубні бульбы), таму ёсць верагоднасць, што ўсходы, якія з'явяцца да 10 красавіка, могуць загінуць.

Канец сакавіка і пачатак красавіка ўвогуле найбольш рызыкоўны час для пасадкі бульбы, бо яшчэ цалкам магчымы снег.

Што датычыцца садаводчых участкаў, дзе пад бульбу адводзіцца, як правіла, невялікая плошча, то яго ўладальнікі могуць высаджваць яе і зараз, лічыць Мар'ян Рубель. Аднак пры паніжэнні тэмпературы плантацыі бульбы неабходна абавязкова прыкрыць плёнкай або спецыяльным матэрыялам спанбонд.

Таццяна ЛОБАС, БЕЛТА.

Акадэмік Віктар ІПАЦЬЕЎ:

«ЛЕС АБАРОНІЦЬ ЧАЛАВЕКА — ДАПАМАЖЫ ЯМУ»

Пачатак гэтага года азнаменаваўся для дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут лесу» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі тым, што атрымалі міжнароднае прызнанне даследаванні групы вучоных па ачыстцы лесу і паверхневага слою глебы ў ім ад радыенуклідаў, на што быў выдадзены першы ў галіне лясной гаспадаркі краіны еўразійскі патэнт на вынаходніцтва. Адначасова была выканана просьба расійскіх калег распрацаваць спецыяльную Федэральную навуковую праграму для тэрыторыі Расіі па рэабілітацыі лясоў у зонах найбольшага забруджання паўднёва-заходняй тэрыторыі Расійскай Федэрацыі на перыяд да 2010 года, і гэта работа таксама атрымала высокую ацэнку. Унікальнасць вынаходніцтва гомельскіх вучоных у тым, што метады, якія імі прапаноўваюцца, экалагічна і эканамічна мэтазгодныя і вельмі важныя для зямель, пакрытых ядзерным попелам. Аб гэтым мы гутарым з акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэмікам Расійскай акадэміі сельскагаспадарчых навук, незалежным экспертам ААН па лесу ад краін Усходняй Еўропы Віктарам Іпацьевым.

— Віктар Аляксандравіч, асабіста вамі была выказана гіпотэза аб магчымым аздараўленні лесу і глебы ва ўмовах глабальнага радыеактыўнага забруджання ящчэ ў сярэдзіне дзевяностых гадоў. А вось цяпер гэта навукова і практычна даказана...

— Падкрэслю: упершыню ў свеце і ў радыеэкалогіі. Групай вучоных інстытута, у які, акрамя мяне, увайшлі Мікалай Іванавіч Булко, Мікалай Васільевіч Міцін і Марына Аляксандраўна Шабалева.

Пасля ядзернага выбуху на Чарнобыльскай АЭС у цэнтры еўрапейскага кантынента ўтварылася «пляма» ў чатыры мільёны гектараў з радыяцыйна забрудженых лясоў, якія ў адрозненне ад іншых прыродных ландшафтаў вельмі трывала замацавалі ў сваім біялагічным кругавароце небяспечныя ядзерныя ападкі. У Беларусі гэтая «пляма» займае дзесяць працэнтаў тэрыторыі, на Украіне — 0,3 працэнта, а ў Расіі і таго менш — каля 0,002 працэнта з улікам радыеактыўных плошчаў, якія з'явіліся пасля ядзерных выбухаў на Урале. Таму негатыў і заклапочанасць насельніцтва нашай краіны вышэйшая, чым у славянсуседзяў.

Бяспечных доз апраменьвання няма. Любое апраменьванне прыводзіць у выпадку злаякасных утварэнняў да росту захворванняў у чалавека — менавіта да такога вываду прыйшлі летась спецыялісты Камітэта па біялагічных эфектах іанізуючага выпраменьвання ў Нацыянальнай акадэміі ЗША, якія прааналізавалі ўсю наяўную інфармацыю па ўплыву малых доз радыяцыі на арганізм чалавека. А радыеактыўны лес ператварыўся ва ўстойлівую крыніцу апраменьвання людзей і ўсяго жывога, бо ён стрымлівае распаўсюджванне аварыйных радыенуклідаў па зямной паверхні.

— Але ж, Віктар Аляксандравіч, сёння накоплены вялікі вопыт па зніжэнню накаплення радыенуклідаў у глебе. Ён што, непрыгодны для лясоў?

— Так, непрыгодны. Тое, аб чым вы гаворыце, датычыцца вопыту па зніжэнню накаплення радыенуклідаў у сельскагаспадарчых культурах. Але сама глеба пры гэтым застаецца абсалютна неабароненай ад радыенуклідаў, і таму патрабуецца штогод вялікае фінансаванне на правядзенне агратэхнічных і аграхімічных прыёмаў. Да таго ж працяглае прымяненне мінеральных угнаенняў прыводзіць да расходу глебавых рэзерваў і падзення глебавай урадлівасці.

Лес жа можа затрымліваць, акумуляваць і нераразмяркоўваць праглынутыя ім радыенукліды, але сам па сабе ён не здольны нейтралізаваць тую радыеактыўнасць. Значыць, трэба шукаць нетрадыцыйныя шляхі зніжэння яе. І мы знайшлі гэты шлях — пабудову для асноўных элементаў лясных экасістэм, у тым ліку і для коранезаселеных горызонтаў глебы так званай дынамічнай «біялагічнай перагародкі».

— Што гэта за перагародка? Як ідзе яе пабудова? І як яна працуе?

— Агульнавядома, што дрэвы цягнуць сокі з зямлі. І мінеральныя рэчывы, ваду і г.д. І праз карані, якія маюць розную таўшчыню і знаходзяцца на рознай глыбіні. Самыя тонкія атожылкі — валаскі сваёй большасцю (90—95 працэнтаў), якія сілкуюць дрэвы пажыўнымі рэчывамі, маюць вельмі вузкі гарызонт — верхні слой глебы ў 2—5 сантыметраў, дзе тых пажыўных рэчываў больш за ўсё. Чаму? Таму што сюды трапляе апад з дрэў у выглядзе лістоты, шыгалля, расліннасці і г.д., якія перагніваюць. Але тут жа затаіліся і радыеактыўныя элементы — цэзій і стронцый, якія па сваіх вартасцях падобныя адпаведна на калій і кальцый. Трэба тут сказаць, што ў лесе пажыўных рэчываў не хапае, а ўся расліннасць, у тым ліку і дрэвы. адчуваюць у іх патрэбу. Дык вось, калі ў глебе мала калію і кальцыю, тады ў ход ідуць радыеактыўныя цэзій і стронцый, а калі іх дастаткова, дык тады дрэвы іх «не чапаюць».

У першым выпадку радыяцыя пранікае ў карані, драўніну, крону, лістоту. Апошняя ападае і радыеактыўны элемент «паўзе» ў глебу. І гэта будзе да таго часу працягвацца, пакуль той стронцый, напрыклад, не распадзецца натуральным шляхам.

— Праз колькі гадоў?

— Каб ён напалову разлажыўся, патрэбна, скажам, гадоў трыццаць. А калі шчыльнасць забруджвання высокая, дык цыкл гэты можа паўтарацца пяць ці болей разоў, што раўназначна не менш чым 150 і больш гадоў.

— З гэтага, Віктар Аляксандравіч, відаць, вынікае, што трэба зрабіць так, каб не даць магчымасці радыяцыі «залезці» ў крону дрэва. Ці не так?

— Абсалютна правільна. Будзе сфарміраваны чысты ад радыенуклідаў апад, а на тыя радыенукліды, якія не ўсмакталі карэньчыкі-атожылкі, будуць уздзейнічаць дажджы, вільгаць, якія пагоняць іх уніз, углыб. Але для гэтага неабходна ўнесці ў глебу такія элементы, якія будуць блакіраваць паступленне тых радыенуклідаў у дрэва. Гэта і калій, і лігнін, і розныя так званыя біямасы (металаарганічныя ўгнаенні). Галоўнае, як кажуць, — запусціць пускавы механізм у першы раз, і тады, паўтараю, апад як бы перагароджвае дарогу радыенуклідам. У якасці адцягваючага манеўру можна выкарыстоўваць і прымяненне такіх радыепратэктараў, як маліна, крушына, вярба, некаторыя віды дзікарослага кустоўя, якія перахопліваюць у сасны, елкі, іншых дрэў сілкавальныя рэчывы і тым самым аслабляюць радыенукліды.

— У дакументах Еўразійскага патэнтнага ведамства гаворыцца аб тым, што выдадзены вашаму калектыву патэнт дзейнічае ва ўсіх дзяржавах — удзельніцах Еўразійскай патэнтнай канвенцыі і што пастаўленая задача вынаходніцтва дасягаецца тым, што «ў працэсе росту лясных насаджэнняў у глебу ці на яе ўнясенне прэцыпітату кармавога ў колькасці 50 кілаграмаў на гектар зменшыла ўтрыманне радыецэзію ў кампаненты надземнай фітамасы сасны ў 2,7—2,8 раза, забяспечвае атрыманне мінімальнай забруджанай біямасы драўнінных раслін». Скажыце, Віктар Аляксандравіч, якія метады блакіравання радыенуклідаў вы выкарыстоўваеце ў сваіх доследах?

— Згодзен. Вялікія грошы патрэбны. Але не трэба забываць на тое, што ёсць розніца, атрымаем мы «чысты» лес праз дваццаць гадоў ці праз сто дваццаць. І яшчэ. Неабходна памятаць, што лясны кампанент апраменьвання людзей у радыеактыўна забруджаных лясных рэгіёнах Беларусі пастаянна расце. Калі ў сярэдзіне дзевяностых гадоў ён складаў каля 20—30 працэнтаў, то зараз перавысіў 60 працэнтаў і значна пераўзыходзіць сельскагаспадарчы кампанент. А здаровы лес, у які чалавек будзе хадзіць, — гэта дабрабыт і здароўе нашага народа! Хачу пры гэтым сказаць, што расійскі ўрад ужо выдзеліў для выканання намі распрацаванай федэральнай праграмы, аб якой я сказаў вышэй, фінансавыя ўліванні ў шэсцьдзесят мільёнаў расійскіх рублёў толькі на абсталяванне. Астатнія значныя сумы будуць пералічаны на навуку, зарплату вучоных, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы праз некаторы час. Не спазніцца б і нам...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Рэха публікацыі

«ВУЧЫЦЦА З УСМЕШКАЙ СПРАЎЛЯЦЦА З ЖЫЦЦЁВЫМІ ПЕРАШКОДАМІ...»

Новыя парады горацкага біяэнергатэрапеўта Валянціна Таранава

Артыкул «Лекар і банкір», надрукаваны ў «Звяздзе» напрыканцы сёлетняга студзеня, выклікаў шмат водгукаў чытачоў. Нагадаем, што газета расказала пра біяэнергатэрапеўта Валянціна Мікалаевіча Таранава, які жыве і працуе ў горадзе Горкі. Ён узначальвае мясцовае аддзяленне ААТ «Белінвестбанк», а ў вольны ад працы час займаецца лекарствам. Таранаў атрымаў свае здольнасці ў спадчыну ад дзеда, але пастаянна іх удасканальвае. Яго парады выклікалі жывы інтарэс у чытачоў, людзі звязваліся з Валянцінам Мікалаевічам, прыязджалі да яго і прасілі дапамогі ў самых розных справах. Па просьбе рэдакцыі і чытачоў горацкі доктар нетрадыцыйнай медыцыны абагульніў праблемы, з якімі звярталіся да яго людзі.

— Пасля надрукавання артыкула штодня мне тэлефанавалі дваіх чалавекі, — расказвае Таранаў. — Усе іх праблемы можна ўмоўна падзяліць на некалькі напрамкаў. Давайце пра кожны з іх раскажам.

1. Нямала людзей скардзіцца на **артэрыяльную гіпертэнзію**, альбо «на ціск», як кажуць у народзе.

— Хоць ціск — гэта не хвароба, а сімптом, — нагадвае лекар. — Лічыць гэта за хваробу нельга, як і, напрыклад, высокую тэмпературу. Высокі ціск — гэта рэакцыя арганізма на нейкі раздражняльнік, унутраны ці знешні. На жаль, часта лячэнне зводзяць да выпіскі хімічных прэпаратаў для змяншэння ціску. Такім чынам нагрузка на сэрца змяншаецца, і нібыта праблем няма. Аднак гэта не панацэя, тым больш што рэзка зніжаць ціск чалавеку нельга. Гэта небяспечна ішэміяй мозга — тым, што мы называем інсультам.

Валянцін Мікалаевіч расказвае, што сёння навука не можа даць адназначны адказ на пытанне: што лячыць у аснове артэрыяльнай гіпертэнзіі. Хутчэй за ўсё, накладанне некалькіх негатыўных фактараў адбіваецца на сардэчна-сасудзістай сістэме: тут і паскоранае развіццё атэрасклерозу, і дыябет, і стрэсы...

— І, на мой погляд, менавіта стрэсы вінаватыя ў артэрыяльнай гіпертэнзіі, — найстойвае Таранаў. — Таму што псіхічныя нагрузкі і неўрастэнія, якая ўзнікае ў выніку пастаянных стрэсаў, выклікаюць спазмы дробных сасудаў, што ў сваю чаргу выклікае напружанне ва ўсёй крывяноснай сістэме. Узрастае нагрузка на сэрца, узнікаюць застойныя працэсы ў вянознай сістэме і г. д.

Лепшы сродак у барацьбе з такімі сітуацыямі, вучыць лекар, — гэта самакарэкцыя, супакаенне свядомасці, медытацыя. Як жа навучыцца супакойваць сябе ў гэтым жыцці?

— Над гэтай праблемай працавалі цэлыя інстытуты, і шмат навукоўцаў паклалі сваё жыццё, спрабуючы знайсці сакрэт, — ківае галавой Валянцін Мікалаевіч. — І адно сёння зразумела для ўсіх: калі чалавек не будзе, паводле Эпікура, слізгаць па жыцці і браць паверсе, то будзе дрэнна. Не трэба праблемаваць праз жыццё! Трэба радавацца яму! Ужо колькі пра гэта гаварыць: трэба прачынацца з усмешкай і радавацца сонейку, як дзеці. Тады ўнутры з'яўляецца гармонія. Хоць у дарослых людзей з гадамі гэта атрымліваецца ўсё горш, але трэба вучыцца і імкнуцца.

Што ж датычыцца высокага ціску, то трэба кансультавацца з урачом. І Таранаў раіць не кідацца ў крайнасці: не трэба адмаўляцца ад прэпаратаў для зніжэння ціску і не трэба есці іх кілаграмамі.

— Пад кантролем медыкаў трэба пераасэнсаваць сваю жыццёвую праграму, — гаворыць біяэнергатэрапеўт. — Трэба разабрацца з адмоўнымі фактарамі: вагой цела, рэжымам харчавання, фізічнымі нагрузкамі. Аднак і перастарацца тут нельга, каб не атрымаўся новы стрэс для арганізма. Усё павінна быць у меру.

(Працяг будзе.)

Ілона ІВАНОВА.

СУПРАЦОЎНІКІ АБЛВЫКАНКАМА — НА СУБОТНІКУ Ў «ЖДАНОВІЧАХ»

Падчас суботніку ў Мінскай вобласці 31 сакавіка прыкладна 50 супрацоўнікаў апарату Мінаблвыканкама будуць працаваць на добраўпарадкаванні цяплічнага комплексу ў агракамбінаце «Ждановічы», паведаміў намеснік старшыні выканкама Анатоль МІРЧУК.

Ён адзначыў таксама, што ў звычайным рэжыме будуць працаваць будаўнічыя арганізацыі вобласці, якія задзейнічаны на будаўніцтве жылых дамоў у рамках Праграмы адраджэння і развіцця вёскі. Акрамя таго, «дасягнута дамоўленасць з упраўленнем адукацыі Мінаблвыканкама аб тым, што да аказання дапамогі ў навядзенні парадку будуць прыцягнуты навучэнцы ўсіх школ вобласці».

Суботнік, які пачнецца 31 сакавіка, працягнецца да 15 красавіка. Акрамя добраўпарадкавання населеных пунктаў, будуць прыводзіцца ў належны стан дарогі і прыдарожныя тэрыторыі, сельскагаспадарчыя ўгоддзі, тэрыторыі фермаў і г. д.

Анатоль Марчук дадаў: кіраўніцтва аблвыканкама дамовілася са старшынямі райвыканкамаў аб тым, што тэрыторыі населеных пунктаў вобласці і жылыя дамы будуць на доўгатэрміновай аснове размеркаваныя сярод прадпрыемстваў гэтых населеных пунктаў для добраўпарадкавання.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

МАЦІ-ЗАБОЙЦА АТРЫМАЛА 10 ГАДОЎ

Мінскі абласны суд вынес прыгавор па справе аб забойстве нованароджанага дзіцяці. Аб гэтым паведаміла старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Таццяна Калініна.

30-гадовая непрацуючая жыхарка Барысаўскага раёна намерана ўтойвала сваю цяжарнасць ад родных і медработнікаў. У кастрычніку 2006 года, нарадзіўшы ў двары сельскага дома жыцця здольнага хлопчыка, яна нанесла яму ўдар нажом у вобласць шыі. Ад пашкоджання шыйнай артэрыі і пазваночніка нованароджаны памёр. Жанчына паклала цела ў цэлафанавы пакет і схавала ў сметніку. Раніцай з-за рэзкага пагаршэння стану ёй прыйшлося звярнуцца ў бальніцу і расказаць пра крымінальныя роды.

На судзе маці-забойца спрабавала апраўдацца тым, што мае дваіх непаўналетніх дзяцей і, знаходзячыся ў няўдачным грамадзянскім шлюбе, лічыла нараджэнне трэцяга дзіцяці нежаданым. Забойства немаўляці жанчына тлумачыла як выпадковае пашкоджанне шыі пры пераразанні пупавіны. Аднак суд прызнаў яе вінаватай ва ўчыненні забойства нованароджанага і прызначыў пакаранне ў выглядзе 10 гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь пакінуў прыгавор у сіле.

Таццяна ШАБЛЫКА, БЕЛТА.

Гастролі

Што калі памяняцца гледачамі?..

Так робяць, напрыклад, два нашыя нацыянальныя тэатры — імя Купалы і імя Коласа. Купалаўцы пяць лепшых спектакляў пакажуць у Віцебску, коласаўцы з 1 па 5 красавіка будуць пакараць сталічную публіку. Цікава, чым?

...Здані мінулага ажываюць, дух сярэднявечча нараджае думкі пра смерць і вечнасць, над якімі не ўладарыць самае моцнае каханне. І гэта 1 красавіка! Выключна для тых, каму надакучыў смех без прычыны... Затое якая рамантыка — гісторыя Барбары Радзівіл, якую сталічны глядач ведае як «Чорную панну Нясвіжа», віцебскі варыянт. У тэатры імя Коласа спектакль паводле п'есы Дударава мае назву «Чорная нявеста», яго паставіў рэжысёр, мастацкі кіраўнік віцебскага тэатра Віталь Баркоўскі. Гэта той самы спектакль, які быў прызнаны лепшай пастаноўкай у Беларусі ў 1999 годзе. Між іншым, можна параўнаць з тым, які ў гэтыя дні будуць глядзець у Віцебску.

2 красавіка і не думайце ўздыхаць з палёгкай: танец згубленых душ на малой сцэне! Або містыка працягваецца, на гэты раз з дапамогай замежнай драматургіі — спектакль «Тузы» (паводле Урс Відмэр) распавядае пра маральныя пакуты кіраўнікоў, якія па розных прычынах звольнены з працы. Вельмі сучасна...

Увечары на вялікай сцэне будзе панаваць народная артыстка Беларусі Святлана Акружная — у ролі Лаўры ў драме паводле Аўгуста Стрынберга «Бацька». І яшчэ з сучаснай замежнай драматургіі ў афішы коласаўцаў маецца пастаноўка «Дакрануцца вуснамі да нябёсаў» паводле п'есы Тэнэсі Уільямса «Стары квартал». Багатую рускую драматургію тэатр не абмінуў: 4 красавіка на вялікай сцэне тэатра імя Купалы віцябчане іграюць Набокава — «І смех, і слёзы, і любоў».

А што там яшчэ ідзе? З нашага, беларускага?.. Трагікамедыя Уладзіміра Драздова «Мадам Броншанс». Другая частка трылогіі пра жыццё і лёс мастакоў, што нарадзіліся на беларускай зямлі і сталі вядомыя на ўвесь свет. Адзін з іх — Хацім Суцін, якім захапляўся Мадзільяні.

І Купалам варта захапляцца. «Сон на кургане» ў пастаноўцы Баркоўскага распавядае новымі прыёмамі пра дарагое і вечнае.

Такой жа мовай будзе гаварыць у Віцебску Купалаўскі — ён пачне свае гастролі з «Сымона-музыкі» паводле Коласа. Да яго далучыцца «Чорная панна Нясвіжа», «Чычыкаў» паводле Гогаля, у версіі Куряёчыка і пастаноўцы Валерыя Раеўскага. Цудоўную кампанію падтрымае чароўны «Маэстра».

Ларыса ЦІМОШЫК.

З жыцця кантрабандыстаў

ВАГОН З «ДВАЙНЫМ ДНОМ»

Партыю падпольнай украінскай гарэлкі выявілі аператыўнікі Гомельскай мытні ў пасажырскім цягніку «Кіеў—Санкт-Пецярбург».

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта, напачатку патаемнае сховішча было выяўлена пад падлогай у адным з купэ. Там мытнікі знайшлі 12 бутэлек гарэлкі «Nemiroff». Пасля грунтоўнай праверкі ўсяго вагона, мытнікі знайшлі яшчэ некалькі тайнікоў у калідоры: пад абіўкай і падлогай былі прыхаваны 56 бутэлек украінскай гарэлкі. Неўзабаве высветлілася, што «заначку» зрабілі праваднікі вагона. Па факту кантрабанды гарэлкі складзены пратаколы аб адміністрацыйных мытных парушэннях. Матэрыялы справы перададзены ў суд Цэнтральнага раёна Гомеля, які і паставіць апошнюю кропку.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Хто ў выйгрышы ад аб'яднання медустаноў?

Зварот у карпункт

Памятаю, калі ў Баранавічах пачалі аб'ядноўваць медыцынскія структуры горада і раёна, я пацікавіўся ў аднаго начальніка, які курыруе мясцовую медыцыну: для чаго гэта робіцца?

— У гараджаніна большыя магчымасці пры карыстанні медыцынскімі паслугамі, чым у сельскага жыхара, а аб'яднанне створыць для ўсіх аднолькавыя ўмовы. Абслугоўванне па якасці на раёне будзе такім жа, як і ў горадзе, — упэўнена заявіў мой суразмоўца.

Прайшло некалькі гадоў з таго часу. Днямі патэлефанавала жыхарка пасёлка Гарадзішча і расказала пра сваю бяду.

Пенсіянерка перанесла інсульт і цяпер ёй неабходна двойчы на год для рэабілітацыі бываць у бальніцы, але падлячыцца не заўсёды ўдаецца, бо няма месцаў. Жанчына ўпэўненая, што ва ўсім вінаватае аб'яднанне, якое прывяло да таго, што месцы ў раённай і ўчастковых бальніцах сёння займаюць гараджане, а вясковаму чалавеку, сцвярджае яна, даводзіцца чакаць і спадзявацца.

Раней вяскоўцы лячыліся ва ўстановах раённага падпарадкавання, а гарадскія, адпаведна, у сваіх. Гараджанін, як правіла, не мог трапіць на лячэнне ў раённую бальніцу. Тут нават не ўзнікала пытання — тэрытарыяльны падзел захоўваўся і ніхто не спрабаваў яго парушаць. З аб'яднаннем жа гэты падзел быў ліквідаваны. Усе медустановы маюць адно падпарадкаванне і цяпер, здавалася б, гараджане і вяскоўцы сапраўды атрымалі аднолькавыя правы на лячэнне. Праўда, пры аб'яднанні «рэзекцыю» зрабілі медработнікам раёна, а не горада. Пэўная колькасць іх трапіла пад скарачэнне. Але наша задача — устанавіць, ці на самай справе жыхары Баранавіч «акупавалі» бальніцы раёна, як сцвярджае пенсіянерка з Гарадзішча.

Прыйшлося патэлефанаваць у бальніцы, каб высветліць сітуацыю. Сапраўды, гараджане ў многіх участковых бальніцах — ужо «свае людзі». Напрыклад, у той жа Гарадзішчанскай бальніцы з 45 месцаў 17 займаюць жыхары горада. І ў Вольнянскай бальніцы сястрынская нагляду — аналагічная сітуацыя. Там знаходзяцца састарэлыя, з якіх 75 працэнтаў — ляжачыя. Часам нямоглых накіроўваюць з Баранавіч, а для вясковых месцаў не заўсёды хапае. Ёсць гарадскія жыхары і ў іншых участковых бальніцах раёна.

Як бачым, воляй-няволяй, магчымасці вясковага чалавека дзякуючы такому аб'яднанню і сапраўды некалькі звузіліся. Калі раней усе так званыя койка-месцы належалі пры неабходнасці толькі вяскоўцам, то зараз даводзіцца, што называецца, дзяліцца.

Калі пенсіянерцы пасля інсульту неабходна падлячыцца ў неўралагічным аддзяленні, то чаму б яе не накіраваць у гарадскую бальніцу? Ва ўсякім разе, тут быў бы хоць нейкі парытэт. На логіцы, калі ў раённай бальніцы могуць лячыцца жыхары горада, то ў гарадской, адпаведна,— вясковы люд. Відаць, так атрымліваецца не заўсёды, раз узнікаюць скаргі.

А ці палепшылася медыцынскае абслугоўванне сельскага насельніцтва? Зрухі да лепшага відавочныя. Напрыклад, калі ў вёску цяпер выязджаюць медработнікі, то ў брыгадзе ёсць і ўрач, а да аб'яднання яго не было. Але гэты факт нічога не мяняе — медыцынскае абслугоўванне для жыхароў вёскі і горада павінна быць аднолькавым. І калі ў Баранавічах не хапае бальнічных ложкаў, то магчыма, варта акумуляваць сродкі для пашырэння магчымасцяў, бо нічога больш важнага, чым здароўе людзей няма.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

(Працяг. Пачатак у нумары за 29 сакавіка.)

«Белы» тыдзень — час вялікіх пачынанняў

Чысты панядзелак

Апошнія шэсць дзён перад Вялікаднем былі пазначаны статусам асаблівай павагі і прынцыпова дакладным стаўленнем да свайго жытла і працы. Кожны з іх набліжаў чалавека да канчатковай перамогі Дня над Ноччу, а ў хрысціянскай традыцыі — Жыцця над Смерцю. Таму сустрэчы такой незвычайнай падзеі папярэднічала карпатлівае абнаўленне ўсяго навакольля. Першыя дні тыдня былі прысвечаны навядзенню парадку, калі можна так сказаць, спачатку на перыферыйных абшарах сядзібы — у садзе, агародзе, хляве, а затым ужо ў хаце — у цэнтры сялянскага сусвету, таму гэтыя дні называліся «чыстымі»: Чысты панядзелак, Чысты аўторак.

У Чысты панядзелак пачыналі наводзіць парадак у двары, каля гумна, хлява, адусюль выграбалі мінулагодняе смецце. Абавязкова прыбіраліся ў садзе, спальвалі або закопвалі старое лісце і сухое галлё. Менавіта ў гэты дзень бялілі хату і ўсе дваравыя пабудовы. Наводзілі парадак і ў хляве: чысцілі хатнюю жывёлу, выкідвалі гной.

Чысты аўторак

У аўторак пачыналі наводзіць парадак у хаце. Усё хатняе начынне выносілі з хаты, перасушвалі, выбівалі пыл, вымывалі вокны, выміналі з усіх закуткоў смецце, бялілі печ, абавязкова пралі: «У чысты панядзелак і аўторак няможна ў хаце трымаць чаго-небудзь нячыстага, бо на людзей і на гавяда нападуць паршы».

У сераду на перадвелікодным тыдні трэба было вымыць усё драўлянае: дзяжу, хлебную лапату, выскрабалі сталы, лавы і г. д. Таму і дзень атрымаў такую незвычайную назву — Дравяная страсць.

Напрацягу сямітыднёвага посту хлебная дзяжа шматразова аказвалася ў цэнтры ўвагі. Так, на Палессі ў першую суботу посту хлебную дзяжу трэба было вымыць, абкурыць ядлоўцам, пакласці на дно вугельчык і накрыць чыстым ручніком. Казалі, што ў гэты дзень адбываецца «споведзь дзежкі», таму трэба, каб яна была «прыбраная». Расчыняць у гэты дзень хлеб забаранялася. На Піншчыне дзяжу трэба было вымыць у суботу на Пахвальным (пятым) тыдні посту. Ваду пасля таго, як вымылі дзяжу, трэба было абавязкова выліць на сцяну хаты. Асаблівую ўвагу прыладам, з дапамогай якіх будзе выпечаны «велікодны хлеб» — дзяжы і хлебнай лапаце — удзялялі ў сераду перад Вялікаднем.

Чысты чацвер — першы дзень тварэння новага свету

Калі панядзелак, аўторак і серада перадвелікоднага тыдня былі часам поўнамаштабнага ачышчэння прасторы сялянскай сядзібы і непасрэдна жытла, то Чысты чацвер ставіў заключную кропку ў працяглым і паэтапным працэсе ўсеагульнага развітання (інфармацыйнага, энергетычнага, гаспадарчага) з мінулым часам. Яго вялікасць чалавек — той, хто перайначваў асвоеную ім прастору, вынішчаючы сляды леташняй дзейнасці (каб не «перацягнуць» старыя праблемы ў новы час) — аказваўся апошнім звяном у шматдзённым ланцугу ачышчальных дзеянняў. Лічылася, што ўсход сонца гэтага дня ўжо сам чалавек павінен быў сустрэць абноўленым, чыстым.

Сярод навукоўцаў, якія абапіраюцца на звесткі вясковых інфармататараў, існуе два падыходы ў разуменні семантыкі паняцця «Чысты чацвер». З аднаго боку, лічаць яны, дзень атрымаў такую назву, таму што ён быў асноўным днём навядзення агульнага парадку: «Перад Паскай — сама рабочая нядзеля, нада павымыць усё, у Чысты чацвер і коміны чысцюць, і хату вымываюць». З другога — дзень назвалі чыстым таму, што да гэтага дня ўжо ўсё было прыбрана: «У Чысты чацвер мы нікагда ня мыем. Было прынята ўсё вычышчаць, вымываць — і паталок, і сцены — да чацвярга. У Чысты чацвер ужэ было ўсё чыста ў хаці, за тое мы нікагда не балелі, у хаце ні балезней ні будзець, нічога благога ні будзець». Нам падаецца, што другая версія больш абгрунтаваная і набліжаная да архаічнай сутнасці аналізуемай з'явы.

Магічная энергія прыродных стыхій

У міфапаэтычных уяўленнях нашых прашчураў і больш блізкіх продкаў важнае месца займала багатая і надзвычай складаная сістэма абрадавай практыкі, скіраваная на актыўны дыялог чалавека з Сусветам. У гэтым ланцужку магічных дыялогаў вылучаліся некалькі дзён, якія былі пазначаны статусам надзвычайнай выключнасці. Напрыклад, у хрысцянскай традыцыі такім статусам надзелены дзень праваслаўнай Пасхі, калі з Нябёсаў сыходзіць Благадатны Агонь.

У старажытных вераваннях славянскіх народаў асаблівай пашанай вылучалася некалькі дзён традыцыйнага календара. Сярод іх каляднае ноч у прамежку з трох гадзін ночы і да пяці гадзін раніцы, калі «адкрываліся» нябёсы і чалавек мог вымаліць у Бога любое жаданне аб пазбаўленні ад хваробы, аб паляпшэнні дабрабыту, аб шчаслівай долі, аб нараджэнні доўгачаканага дзіцяці... Такім жа днём здзяйснення жадання-мроі была купальская поўнач, калі моладзь хадзіла шукаць самы незвычайны зямны скарб — папараць-кветку.

Ступенню надзвычайнай святасці надзялялася і «навагодняя» ноч — з серады на чацвер перадвелікоднага тыдня. Яна была такой жа, як і вышэйзгаданыя, але разам з тым і зусім іншай. Калі ў калядную ноч да Бога звяртаўся той, хто трапіў у вельмі складаныя сітуацыі, калі купальская кветка «давалася ў рукі» толькі выключным асобам, то ноч з серады на Чысты чацвер у роўнай ступені «адорвала» энергіяй ачышчэння, тварэння і аздараўлення кожнага, хто гэтага хацеў. Гэта была ноч усеагульнай уключанасці чалавечай супольнасці ў кантэкст свяшчэннага акта першатварэння. Зоры, Сонца, Месяц, іншыя планеты нашай Галактыкі быццам знітоўвалі сваю касмічную моц у адзін прамень і накіроўвалі яго да Зямлі, каб кожны чалавек змог «назапасіць» яе на ўвесь наступны год. Чалавек выкарыстоўваў гэту магчымасць рознымі шляхамі. Але найперш ён звяртаўся па дапамогу да самых першых і найбольш пашыраных стыхій прыроды: вады, солі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

(Працяг будзе.)

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ЯНВАРЯ 2007 Г.
ОАО «УНИВЕРСАМ ЗАСЛАВЛЬ» Г. МИНСК, ПР-Т ПОБЕДИТЕЛЕЙ, 49

млн. руб.

Наименование показателя	Код строки	На начало года	На конец года
Актив			
1. Внеоборотные активы	190	765	971
2. Оборотные активы	290	798	935
Баланс	**390**	**1563**	**1906**
Пассив			
3. Источники собственных средств	590	795	1053
4. Доходы и расходы	690	-46	-43
5. Расчеты	790

Для забаў гасцей на кобрынскай ферме будуць праводзіцца страусавыя забегі

На страусавай ферме ў вёсцы Козішча Кобрынскага раёна (Брэсцкая вобласць) пачата будаўніцтва пляцоўкі для правядзення страусавых забегаў.

Як паведаміў менеджар СААТ «ПМ і Кампанія», якой належыць ферма, Сяргей Гапановіч, ужо зараз пабудаваны вальер для ўтрымання бегавых страусаў, вядзецца падрыхтоўка пляцоўкі пад будаўніцтва дзвюх бегавых дарожак па 100 м кожная са спецыяльнай агароджай. Побач запланавана абсталяваць пляцоўку для гледачоў, а таксама размясціць мінізаапарк, кафэ і сувенірную майстэрню.

Плануецца, што першыя страусавыя забегі наведвальнікі фермы змогуць убачыць гэтым летам. Да гэтага часу шэсць афрыканскіх птушак будуць спецыяльна абучацца. Неабходна адзначыць, што страусавыя забегі стануць адным з пунктаў экскурсіі па страусавай ферме.

Сумеснае беларуска-польскае прадпрыемства «ПМ і Кампанія» арганізавана ў 2003 годзе. Прадпрыемства спецыялізуецца на вырошчванні чорнага афрыканскага страуса з поўным цыклам, які ўключае інкубаванне яек, вырошчванне маладняку і забой птушкі на мяса і скуру. Праектная магутнасць страусавай фермы складае 1000 галоў у год. Страусы знеслі ўжо больш як 1500 яек сярэдняй вагой 1,5 кг. Зараз на ферме ўтрымліваецца каля 700 птушак.

Вольга КАБЯК, БЕЛТА.

Далёкае — блізкае

ЖЫЛІБЕР ВЯРТАЕЦЦА Ў ГРОДНА

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Наведвальнікаў гарадскога парку ў Гродне, які носіць імя Жана Эмануэля Жылібера, верагодна, ужо сёлета будзе сустракаць... сам заснавальнік унікальнага батанічнага саду, што тут некалі быў. Пакуль жа ў майстэрні вядомага скульптара, старшыні Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага саюза мастакоў Уладзіміра Панцялеева, дзе мы днямі пабывалі, завяршаецца праца над «гліняным» варыянтам скульптуры, які затым пераўвасобіцца ў бронзу.

Творы гэтага майстра можна ўбачыць не толькі ў Беларусі, але і, напрыклад, у Крыме, у Гурзуфе, дзе ён высек з амаль трохметровай каменнай глыбы алегарычную кампазіцыю (бацькі і дзіця) пад назвай «Акрыленыя». А некаторыя яго так званыя кабінетныя, або, інакш кажучы, камінныя скульптуры палічылі за гонар мець у сваіх калекцыях вядомыя людзі з замежжа. Той-сёй ужо і сам бы «забронзавеў», аднак ва Уладзіміру Панцялееве і блізка няма рысаў самазадаволенага мэтра. Наадварот, ураджэнец Магілёўшчыны лічыць, што як скульптар ён яшчэ ў вялікім даўгу перад горадам над Нёманам, да якога прыкіпеў усёй душой.

— Я стаўлю задачу — зрабіць у горадзе прарыў у накірунку паркавай скульптуры, якой у нас, на жаль, пакуль проста няма, — гаворыць Уладзімір Панцялееў. — Прычым не паўтараючы нашу сталіцу ці замежжа, а з мясцовым каларытам, узаемазвязана з гісторыяй Гродна. Гэта ж каралеўскі горад! Нідзе не было столькі славутасцяў, як тут!

Добра, што важнасць такога падыходу да мастацкага афармлення горада разумеюць і мясцовыя ўлады. А прыкладаў таго, як жанр малой, паркавай скульптуры можа арганічна спалучацца з асаблівасцямі той ці іншай тэрыторыі, стаць «мастом» паміж рознымі эпохамі альбо проста ствараць адпаведную аўру, у свеце мноства. Скажам, на плошчы ў Лодзі сядзіць за раялем знакаміты маэстра Рубінштэйн. У Брэмене не толькі не забыліся на сваіх сусветнавядомых музыкантаў, але і адлюстравалі іншыя сюжэты з мясцовага жыцця, тых жа свінапасаў. Расіяне паставілі помнік літары «ё» і водаправодчыку, беларусы ўшанавалі дзяўчынку з парасонам, паставіўшы помнік у Мінску, і аловак — у Гомелі... У Вроцлаве мэрыя нават аб'яўляе конкурс на лепшыя малыя скульптуры з іх далейшай устаноўкай у горадзе і прэміяваннем скульптараў.

А вось у Гродне гэты жанр пачынаецца з Жана Эмануэля Жылібера. Гэтая скульптура, пэўна, у сэнсе павагі да гісторыі горада здольна зрабіць нават больш, чым кніга або аповед экскурсавода, паколькі менавіта зрокавы вобраз надоўга застаецца ў памяці. І потым ужо не кожны, канешне, але шмат хто захоча спытаць у сябе: «А што я ведаю пра гэту асобу? Чаму менавіта Жылібер сустракае гараджан і гасцей Гродна на ўваходзе ў парк?»

Ды таму, што гэта ён, Жан Эмануэль Жылібер, выдатны французскі вучоны-натураліст стварыў у Гродне батанічны сад, які разам з Лонданскім і Пецярбургскім быў прылічаны да найлепшых у Еўропе. У 1778 годзе тут налічвалася 1500 відаў экзатычных раслін. Гэта ён, прафесар медыцыны кіраваў першай на тэрыторыі сучаснай Беларусі каралеўскай медыцынскай акадэміяй, выхаванцы якой займаліся вырошчваннем у батанічным садзе лекавых раслін. Потым Жылібер залажыў таксама выдатныя батанічныя сады ў Вільні, у французскім Ліёне...

Ініцыятарам стварэння медыцынскай акадэміі быў яшчэ адзін знакаміты гродзенец — палітычны дзеяч, рэфарматар гаспадаркі, мецэнат культуры, гродзенскі староста Антоній Тызенгаўз. Уявім сабе і гэту постаць у сучасным горадзе, пэўна, на плошчы Тызенгаўза. А на вуліцы Ажэшка, не выключана, калісьці сустрэнем і скульптуру пані Элізы, якая гуляе з сабачкам. А ў якім мастацкім стылі будзе ўвасоблены вобраз караля і Вялікага князя Літоўскага Стэфана Баторыя?

Тэмаў у гэтым накірунку, лічыць Уладзімір Панцялееў, непачаты край, нават, на першы погляд, зусім нечаканых. Скажам, цяпер скульптар працуе над увасабленнем ідэі рэктара Гродзенскага медуніверсітэта паставіць помнік ... сабачку, звычайнаму дварняжку, які ў свой час самаахвярна служыў медыцынскай навуцы.

— Ляжа бронзавы сабачка ля нейкага ліхтара, лаўкі — я вас запэўніваю, адбою не будзе ад зацікаўленых позіркаў, — лічыць Уладзімір Панцялееў.

А хіба ж не ўпрыгожыць набярэжную Нёмана скульптура рыбака? Дарэчы, скульптура Уладзіміра Панцялеева «Воўк» у гонар 1000-годдзя Ваўкавыска была ўстаноўлена зусім нядаўна, але ўжо стала для гэтага горада ў пэўным сэнсе культавай. Каля яе пастаянна фатаграфуюцца і нават ужо ёсць прыкметы, маўляў, воўчы нос пацерці — да грошай, лапу — яшчэ да нечага.

...Так склаўся лёс, што Жан Эмануэль Жылібер не здолеў ажыццявіць у Гродне ўсе свае задумы, у прыватнасці, стварыць сельскагаспадарчую і ветэрынарную школы. А яго мецэнату Антонію Тызенгаўзу (яго заслуга не толькі ў адкрыцці медыцынскай акадэміі, але і ў заснаванні шэрагу мануфактур, школ гандлю, будаўніцтва, музычнай, балетнай, бухгалтарскай, акушэрскай, у пракладванні новых дарог, мастоў і каналаў...) так і не ўдалося рэалізаваць ідэю стварэння ў Гродне акадэміі навук. Пасля таго, як Тызенгаўза у выніку магнацкіх інтрыг звольнілі з пасады гродзенскага старасты, Жылібер быў вымушаны пакінуць горад над Нёманам. І вось цяпер ён вяртаецца — фігурай чалавека, які прагульваецца з кіем у руцэ па сучаснаму парку. У касцюме сваёй эпохі, але звычайнага росту, і не на пастаменце, а на бруску. Славутая асоба з мінуўшчыны старадаўняга горада, такім чынам, будзе не ўзвышацца над цяперашнімі пакаленнямі, а быццам знаходзіцца разам з намі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Глядзіце!

ДЗВЮХЗОРКАВАЕ ШОЎ ПА СІСТЭМЕ «ЎСЁ ЎКЛЮЧАНА»

Калі чалавек, няхай сабе і вядомы, але раней на эстрадзе не заўважаны, пачынае спяваць на ўвесь голас, навакольныя або круцяць пальцам ля скроні, або з пэўным задавальненнем прыслухоўваюцца да гэтых трэляў (залежыць ад таго, ці моцна мядзведзь наступіў на вуха спеваку-аматару). Аднак калі той самы чалавек бярэ ў «напарнікі» вопытнага вакаліста і выходзіць з мікрафонам на суд шаноўнай публікі — глядзяць і слухаюць усе. Бо гэта фармат тэлешоў «Дзве зоркі». Праект з такой назвай паспяхова прайшоў у Расіі, а з 31 сакавіка на шэсць тыдняў «прапісаўся» і ў нас.

Фота Сяргея ЧОРНАГА.

Так Валерыя АРЛАНАВА і Георгій КАЛДУН сустрэліся на «Вернісажы».

Паводле правілаў, у гульню ўступае тузін дуэтаў, якія складаюцца з аднаго прафесійнага вакаліста і аднаго дылетанта. Пары развучваюць пэўныя кампазіцыі — добра вядомыя, але спецыяльна для шоў перакладзеныя ў новую аранжыроўку — і падчас здымак выконваюць песні ў суправаджэнні «жывога» аркестра. Журы ацэньвае выступленні, улічваючы не толькі майстэрства выканаўцаў, але таксама артыстызм, згуртаванасць дуэтаў і пастаноўку нумара. Пасля строгага судзейства дзве пары, якім дасталася найменшая колькасць балаў, трапляюць у намінанты на «вылет». Тут ужо справа за гледачамі, якія прысутнічаюць у зале. 125 спецыяльных пультаў для галасавання — і лёгкім націскам кнопачак выбіраецца, каму пакінуць шоў, а каму застацца. Пасля трох шоў у намінацыю трапляюць адразу тры пары, адну з якіх выратоўваюць гледачы. На апошнім шоў у праекце павінна застацца шэсць дуэтаў, пераможца сярод якіх вызначаецца інтэрактыўным галасаваннем. У якасці прыза кожны ўдзельнік «пары нумар адзін» атрымлівае аўтамабіль.

«На ганку ўдваіх» змясціліся ЖАНЭТ і Генадзь ДАВЫДЗЬКА.

Самыя спрытныя, напэўна, паспелі зрабіць падлікі і здзівіцца — якім гэта чынам у фінал трапляе шэсць пар? Куфэрак адчыняецца проста: у беларускім варыянце «Дзвюх зорак» выступаюць не 24, а 26 удзельнікаў — 13 дуэтаў. Проста падчас рэпетыцый высветлілася, што адной з пар — вядучай АНТ Вользе Паляковай і кіраўніку ансамбля «Сябры» Анатолю Ярмоленку — вельмі цяжка спецца. Таму пару разбілі і прапанавалі кожнаму ўдзельніку іншых партнёраў. Вядучых шоў у нас не двое, а ўсяго адзін, затое які — экс-ігрок КВЗ, а зараз адзін з вядучых рэзідэнтаў маскоўскага «Камедзі Клаб» Вадзім Галыгін.

У журы на першым выпуску шоў «Дзве зоркі» засядуць Лідзія Ярмошына, Расціслаў Янкоўскі, Юрый Казіятка, Барыс Луцэнка і Люся Лушчык (ой, прыгадае тэлевядучая некаторым канкурсантам ацэнкі на «Зорным цырку»!). А ў рэпертуары ўдзельнікаў — хіты савецкага часу і песні з кінафільмаў, ад страснага «Каханне, навошта ты мучыш мяне» (к/ф «Сабака на сене») да ўзвышана-пранікнёнага «Ёсць толькі міг» (к/ф «Зямля Саннікава»), ад «Мільёна пунсовых руж» да «Гэтых вачэй насупраць».

Напярэдадні запісу шоў нам удалося трапіць на генеральны прагон і паназіраць за артыстамі, так бы мовіць, у рабочай атмасферы.

Ідэі генерыраваліся проста па ходу рэпетыцый, некаторыя тут жа адкідваліся, а некаторыя рэалізоўваліся нават нечакана для прадзюсараў праекта. Напрыклад, спасылаючыся на правілы, арганізатары забаранілі канкурсантам карыстацца ў пастаноўцы нумароў грувасткім рэквізітам — толькі тое, што можна вынесці ў руках. Гэтая ўмова, аднак, не перашкодзіла спеваку Георгію Калдуну і актрысе Валеры Арланавай ператварыць знаёмую ўсім песню «Вернісаж» у... «крымінальнае чытво» па-беларуску. І замест гісторыі сустрэчы маладых людзей атрымаўся раман з шэдэўрам выяўленчага мастацтва. А ўсяго толькі і трэба было, што карціна, пара плакатаў «Вышукваецца», наручнікі і пачуццё гумару ў саміх выканаўцаў.

Аляксею Хлястову і алімпійскай чэмпіёнцы па мастацкай гімнастыцы Юліі Раскінай для выканання песні «Цудоўны сусед» музыканты даставілі сапраўдныя трубу і кларнет. Але дзяўчына хутка адмовілася ад інструмента — непрафесіяналы і без таго губляліся на сцэне, а калі трэба адначасова ўпраўляцца з мікрафонам, іграць на партнёра і рабіць выгляд, быццам нязмушана іграеш на кларнеце — гэта амаль што акрабатычны трук з адначасовымі спевамі.

Якасць выступлення гэтай пары строга ацэньваў маленькі Арцём Хлястоў — ледзь што не спадабаецца, адразу пачынаў хныкаць і крывіцца. Каб супакоіць малога, тату давялося браць яго на рукі, танцаваць і штосьці напяваць. Дарэчы, пазней, ужо на здымках, «Цудоўны сусед» зноў даставіў непрыемнасці Раскінай. Па задумцы, у фінале песні дзяўчына садзілася на шпагат, што выканала. Натуральна, бліскуча і элегантна. Толькі калі Юля вярнулася ў вертыкальнае становішча, стала зразумела, што яна моцна, да крыві, падрапала калена аб пліты сцэнічнай пляцоўкі. Гімнастка паставілася да сітуацыі з гумарам: «Я не лічу, што адбылося нешта страшнае, на трэніроўках нярэдка здаралася і горш».

Элеаноры Язерскай давялося рэпеціраваць у гордай адзіноце — яе партнёр, саліст гурта «Лепрыконсы», быў вельмі заняты на гастролях у Кіеве, і змог выбрацца толькі непасрэдна на здымкі. Так што ў песнях «Пецярбург—Ленінград» і «Міленькі ты мой» былая тэлевядучая выконвала толькі свае партыі, з цяжкасцю трапляючы ў патрэбны момант у музыку. Ёй на дапамогу прыйшоў Мікалай Скорыкаў, які ціха напяваў некаторыя радкі і ўвогуле строіў з сябе манерны аналаг Боры Маісеева.

— Брава, Элеанора Аркадзеўна! — запляскалі ў далоні прадзюсары.

— Вы што, сур'ёзна? — шчыра здзівілася пачынаючая спявачка. У адказ ёй катэгарычна абвясцілі: «На «Еўрабачанне!». Паглядзець на такое відовішча сабраліся, здаецца, усе супрацоўнікі тэатра. І не прагадалі. Потым на сцэну ўзняліся Іна Афанасьева з Жэнем Булкам. Пакуль Іна старанна распявалася для песні «Добрыя прыметы», малады чалавек, як гутаперчавы, танцаваў вакол, робячы неверагодныя піруэты.

— Ён падобны на Джыма Керы ў фільме «Маска», — заўважыў нехта.

— Цудоўна, а давайце яму таксама зеляніны на твар накладзём, — прапанавала Іна, стомленая няўрымслівай актыўнасцю партнёра. Булка ў адказ перабольшана абурыўся:

— Цудоўна, Іна Афанасьева толькі што абазвала мяне зеленню саплівай!

Ніхто з прысутных, уключаючы саму спявачку, не змог утрымацца ад рогату. Калі Жэню ўсё ж прымусілі спяваць, нечакана высветлілася, што ў яго даволі прыемны голас — так што гэты жартаўнік у спалучэнні з абаяльнай Афанасьевай яшчэ складзе канкурэнцыю астатнім дванаццаці дуэтам.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Навіны сталіцы

З ЛІЧЫЛЬНІКАМІ БУДЗЕ ВЫГАДНА

Кожны дзень у кватэрах сталіцы з'яўляецца 1300 новых прыбораў уліку гарачай і халоднай вады. Да канца 2008 года ў жылым сектары Мінска павінна быць усталявана 625 тысяч новых лічыльнікаў. У горадзе пабудавана 532 тысячы кватэр, з якіх адпаведныя прыборы маюць толькі 47 працэнтаў.

Як расказаў начальнік Галоўнага ўпраўлення жыллёвай гаспадаркі Мінскага гарвыканкама Барыс Васільеў, сёлета ў сталіцы з'явіцца 268 тысяч лічыльнікаў вады, а астатняя частка — у наступным годзе. Прыборы будуць усталёвацца па новай тэхналогіі — групавым метадам, па пад'ездах і дамах. «Ужо з сакавіка ўсе камунальныя гаспадаркі сталіцы прымаюць заяўкі ад насельніцтва. Мы будзем працаваць і з прадпрыемствамі недзяржаўнай формы ўласнасці, якія ў прыватным парадку займаюцца ўсталяваннем лічыльнікаў», — паведаміў Барыс Васільеў.

Кошт двух прыбораў разам з усімі тэхнічнымі работамі складзе 180 000—200 000 рублёў. Магчыма, што сацыяльна неабароненым грамадзянам будзе прадастаўляцца магчымасць набыцця прыбора ў крэдыт або ў адтэрміноўку. «Мы пачалі апытваць людзей, каб вызначыць, наколькі запатрабавана прыцягненне банкаўскіх крэдытаў. Увогуле без актыўнай пазіцыі з боку насельніцтва мэта эканоміі рэсурсаў дасягнута не будзе», — каментуе спецыяліст. Нагадаем, што жыльцы кватэр, якія набываюць прыборы ўліку толькі за свой кошт, на тры гады атрымліваюць 20-працэнтную скідку на аплату паслуг.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Крымінал

АДПАЧЫНАК СКОНЧЫЎСЯ ТРАГЕДЫЯЙ

У вёсцы Вазгелы Маладзечанскага раёна падчас пажару загінуў малады чалавек, яшчэ адзін атрымаў апёкі 30 працэнтаў цела.

Кампанія з пяці чалавек паехала на адпачынак на дачу. На ноч у двухпавярховым доме ўключылі абагравальнікі. Тры з іх засталіся начаваць наверсе, астатнія двое рушылі ўніз. Спускаючыся па прыступках, гэтыя хлопец з дзяўчынай адчулі моцны пах дыму. Крыкнуўшы наверх, што пачаўся пажар, яны выскачылі на вуліцу. За імі з дома выбегла яшчэ адна дзяўчына. Крыху пазней — адзін з хлопцаў, якія заставаліся ў памяшканні. Ён атрымаў апёкі галавы, твару, спіны. А апошні так і застаўся ў палаючай дачы...

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАЙШОЎ У ЛАЗНЮ. НЕ МЫЦЦА

У лазню вёскі Любча Лунінецкага раёна зайшоў незнаёмы і дастаў пісталет. Касірка не спалохалася і дала нападаючаму адпор.

На падмогу жанчыне падаспеў яе муж, які знаходзіўся тут жа, у лазні, і рабаўніка звязалі. Пісталет жа быў несапраўдным — цацкай. Нападаючым аказаўся 26-гадовы жыхар вёскі Дуброўка, які пабываў ужо ў турме. Цікава, што ў касе лазні было ўсяго 36 тыс. рублёў.

Узбуджана крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ВУЧАНЬ-РАБАЎНІК

У павільён да індывідуальнага прадпрымальніка зайшоў вучань адной са школ Бярозаўскага раёна і купіў пачак цыгарэт. Затым дастаў нож і запатрабаваў у прадаўца грошы.

Захапіўшы 100 тысяч, рабаўнік кінуўся на вуліцу. Бярозаўскія міліцыянеры затрымалі па гарачых слядах адразу ж. Узбуджана крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
за период с 1 января по 31 декабря 2006 г.
Организация — ОАО «Черметремонт», РБ
Адрес: 223017 Минский район, п. Гатово

млн. руб

Актив	Код строки	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. Внеоборотные активы			
Основные средства (01, 02)	110	4 903	6 136
Нематериальные активы (04, 05)	120	1	1
Доходные вложения в материальные ценности (02, 03)	130	145	-
Вложения во внеоборотные активы (07, 08, 16, 60)	140	-	-
Прочие внеоборотные активы	150	-	-
ИТОГО по разделу I	190	**5 049**	**6 137**
II. Оборотные активы			
Запасы и затраты	210	1 614	822
В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные ценности (10, 14, 15, 16)	211	1 342	471
животные на выращивании и откорме (11)	212	-	-
незавершенное производство (издержки обращения) (20, 21, 23, 29, 44)	213	272	351
прочие запасы и затраты	214	-	-
Налоги по приобретенным ценностям (18, 76)	220	5	9
Готовая продукция и товары (40, 41, 43)	230	216	78
Товары отгруженные, выполненные работы, оказанные услуги (45, 46)	240	-	-
Дебиторская задолженность	250	276	36
В том числе: расчеты с покупателями и заказчиками (62, 63)	251	143	16
расчеты с учредителями по вкладам в уставный фонд (75)	252	-	-
расчеты с разными дебиторами и кредиторами (76)	253	38	20
прочая дебиторская задолженность	254	95	-
Финансовые вложения (58, 59)	260	-	-
Денежные средства (50, 51, 52, 55, 57)	270	1 138	1 101
Прочие оборотные активы	280	-	-
ИТОГО по разделу II	290	**3 249**	**2 046**
БАЛАНС	390	**8 298**	**8 183**
Пассив	Код строки	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. Источники собственных средств			
Уставный фонд (80)	510	127	127
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) (81)	515	-	-
Резервный фонд (82)	520	26	28
Добавочный фонд (83)	530	5 566	6 743
Нераспределенная прибыль (84)	540	369	474
Непокрытый убыток (84)	550	-	-
Целевое финансирование (86)	560	-	-
ИТОГО по разделу III	590	**6 088**	**7 372**
IV. Доходы и расходы			
Резервы предстоящих расходов (96)	610	-	2
Расходы будущих периодов (97)	620	-10	-17
Доходы будущих периодов (98)	630	-	-
Прибыль отчетного года (99)	640	-	-
Убыток отчетного года (99)	650	-	-
Прочие доходы и расходы	660	-	-
ИТОГО по разделу IV	690	**-10**	**-15**
V. Расчеты			
Краткосрочные кредиты и займы (66)	710	60	200
Долгосрочные кредиты и займы (67)	720	42	14
Кредиторская задолженность	730	2 118	612
В том числе: расчеты с поставщиками и подрядчиками (60)	731	235	50
расчеты по оплате труда (70)	732	66	80
расчеты по прочим операциям с персоналом	733	-	3
расчеты по налогам и сборам (68)	734	41	65
расчеты по социальному страхованию и обеспечению (69)	735	24	32
расчеты с акционерами (учредителями) по выплате доходов (дивидендов) (75)	736	-	-
расчеты с разными дебиторами и кредиторами (76)	737	1 752	382
Прочие виды обязательств	740	-	-
ИТОГО по разделу V	790	**2 220**	**826**
БАЛАНС	890	**8 298**	**8 183**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за период с 1 января по 31 декабря 2006 г.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период предыдущего года
1	2	3	4
I. Доходы и расходы по видам деятельности Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	7 121	5 702
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	020	1 203	776
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-020)	030	5 918	4 926
В том числе бюджетные субсидии на покрытие разницы в ценах и тарифах	031	-	-
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	040	5 356	4 362
Управленческие расходы	050	-	-
Расходы на реализацию	060	43	-
Прибыль (убыток) от реализации (030-040-050-060)	070	519	564
II. Операционные доходы и расходы Операционные доходы	080	1 185	2 063
Налоги, включаемые в операционные доходы	090	4	2
Операционные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей) (080-090)	100	1 181	2 061
В том числе: доходы, полученные от продажи активов (кроме ценных бумаг и иностранной валюты)	101	10	2
доходы от операций с ценными бумагами	102	-	-
доходы от участия в уставных фондах других организаций	103	-	-
прочие операционные доходы	104	1 171	2 059
Операционные расходы	110	1 144	2 037
В том числе: расходы, полученные от продажи активов (кроме ценных бумаг и иностранной валюты)	111	5	-
расходы от операций с ценными бумагами	112	-	-
прочие операционные расходы	113	1 139	2 037
Прибыль (убыток) от совместной деятельности	120	-	-
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (100-110+/-120)	130	37	24
III. Внереализационные доходы и расходы Внереализационные доходы	140	201	142
Налоги, включаемые во внереализационные доходы	150	11	15
Внереализационные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей) (140-150)	160	190	127
Внереализационные расходы	170	300	330
Сумма источников собственных средств, направленная на покрытие убытков	180	-	-
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (160-170+180)	190	-110	-203
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД (+/-070+/-130+/-190)	200	446	385
Налоги и сборы, производимые из прибыли	210	239	233
Расходы и платежи из прибыли	220	-	-
Сумма льготы по налогу на прибыль	230	-	-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) К РАСПРЕДЕЛЕНИЮ (+/-200-210-220-230)	240	207	152

СПРАВКА. РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ:

Наименование показателя	Код строки	На конец отчетного периода	
		Доходы	Расходы
1	2	3	4
Расходы на содержание обслуживающих производств и хозяйств	171	-	24
Штрафы, пени, неустойки по неисполнению хозяйственных договоров	172	-	-
Списанная дебиторская и кредиторская задолженность	173	-	-
Кассовые и суммовые разницы	174	101	47
Благотворительная помощь	175	-	-
Недостачи, потери и порча активов	176	-	-
Расходы, потери и расходы в связи с чрезвычайными обстоятельствами	177	-	-
Прочие доходы и расходы	178	100	229

Руководитель **Рупшин И.И.**
Главный бухгалтер **Людчик Л.И.**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
Открытого акционерного общества «САНДАЛ» г. Брест ул. Буденного, 17
по состоянию на 1 января 2007 года

АКТИВ	*Код стр.*	*На начало отчетного года*	*На конец отчетного года*
I. Внеоборотные активы			
Основные средства (01, 02)	110	877	1 034
ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ I	**190**	**877**	**1 034**
II. Оборотные активы			
Запасы и затраты	210	114	212
В т.ч. сырье, материалы и другие аналогичные ценности (10,14,15,16)	211	114	212
Налоги по приобретенным ценностям (18,76)	220	32	45
Готовая продукция и товары (40,41,43)	230	229	282
Товары отгруженные, выполненные работы, оказанные услуги (45)	240	84	104
Денежные средства (50,51,52,55,57)	270	5	6
ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ II	**290**	**464**	**649**
БАЛАНС	**390**	**1 341**	**1 683**

ПАССИВ	*Код стр.*	*На начало отчетного года*	*На конец отчетного года*
III. Источники собственных средств			
Уставный фонд (80)	510	907	907
Резервный фонд (82)	520	6	8
Добавочный фонд (83)	530	23	212
Нераспределенная прибыль (84)	540	157	263
ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ III	**590**	**1 093**	**1 390**
IV. Доходы и расходы			
Расходы будущих периодов (97)	620	-5	-9
Доходы будущих периодов (98)	630	1	
ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ IV	**690**	**-4**	**-9**
V. Расчеты			
Кредиторская задолженность	730	252	302
В т.ч. расчеты с поставщиками и подрядчиками (60)	731	209	248
Расчеты по оплате труда (70)	732	20	19
Расчеты по налогам (68)	734	15	26
Расчеты по социальному страхованию и обеспечению (69)	735	8	7
Расчеты с разными дебиторами и кредиторами (76)	737	-	2
ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ V	**790**	**252**	**302**
БАЛАНС	**390**	**1 341**	**1 683**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателя	*Код строки*	*За отчетный период*	*За аналогичный период прошлого года*
I. Доходы и расходы по видам деятельности			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	1 908	1 573
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	020	334	288
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и других аналогичных обязательных платежей)	030	1 574	1 285
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	040	1 055	909
Управленческие расходы	050	267	229
Расходы на реализацию	060	74	65
Прибыль (убыток) от реализации	**070**	**178**	**82**
Прибыль от операционных доходов и расходов	**130**	**2**	**-**
Прибыль от внереализационных доходов и расходов	**100**	**-**	**8**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД	**200**	**180**	**90**
Налоги и сборы, производимые из прибыли	210	60	37
Расходы и платежи из прибыли	220	2	6
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) К РАСПРЕДЕЛЕНИЮ	**240**	**118**	**47**

Количество акционеров – всего – 87,
в том числе юридических лиц – 1, физических – 86.
Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателя	*Ед. изм.*	*За 2005 год*	*За 2004 год*
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	Млн.руб.	-	-
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	Рублей	-	-
Обеспеченность акции имуществом Общества	Тыс. руб.	39	38
Информация о задолженности			
Наименование показателя	*Ед. изм.*	*За 2006 год*	*За 2005 год*
Просроченная дебиторская задолженность (долгосрочная)	Млн.руб.	-	-
Просроченная кредиторская задолженность (долгосрочная)	Млн.руб.	-	-

Среднесписочная численность работающих (человек) – 52.

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, работ, услуг – производство обуви, розничная торговля.

Существенных фактов (событий, действий) и дополнительной информации в отчетном периоде нет.

По результатам отчетного собрания в 2007 году утверждена сумма на выплату дивидендов в размере 6 миллионов рублей, приходится на одну акцию (с учетом налогов) – 211 рублей. Список акционеров утвержден 19 февраля 2007 года. Выплата дивидендов будет производиться с 15 октября по 20 ноября 2007 г., работникам предприятия в кассе, посторонним – в кассе и почтовым переводом.

Администрация ОАО «Сандал»

ГОДОВОЙ БАЛАНС ЗА 2006 ГОД ОАО «ЭКОМОЛ»
Оршанский район, п/о Заднепровское

АКТИВ	*млн. руб.*	ПАССИВ	*млн. руб.*
1. Основные средства	7793,0	1. Уставный фонд	954,0
2. Нематериальные активы	3,0	2. Резервный фонд	120,0
3. Вложение во внеоборотные активы	457,0	3. Добавочный фонд	8110,0
4. Запасы и затраты	2300,0	4. Нераспределенная прибыль	1169,0
5. Налоги по приобретенным ценностям	370,0	5. Расходы будущих периодов	-258,0
6. Готовая продукция и товары	343,0	6. Краткосрочные кредиты и займы	1615,0
7. Товары отгруженные, выполненные работы, оказанные услуги	3647,0	7. Долгосрочные кредиты и займы	113,0
8. Дебиторская задолженность	202,0	8. Кредиторская задолженность	3670,0
9. Финансовые вложения	103,0		
10. Денежные средства	275,0		
Баланс	**15493,0**	**Баланс**	**15493,0**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2006 ГОД ОАО «ЭКОМОЛ»
Оршанский район, п/с Заднепровское

Наименование показателей	*млн. руб.*
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей)	30673,0
Себестоимость реализации товаров, продукции, работ, услуг	28618,0
Расходы на реализацию	201,0
Прибыль (убыток) от реализации	**1854,0**
Операционные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей)	2922,0
Операционные расходы	2937,0
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	**-15,0**
Внереализационные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей)	297,0

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

СУСТРАКАЕМ ВЯЛІКДЗЕНЬ

Свята святаў

Вясновыя святы, і асабліва Вялікдзень, сімвалізуюць адраджэнне да жыцця. Прыгравае сонейка, набухаюць пупышкі, з'яўляюцца першыя кветкі, з поўдня вяртаюцца птушкі. Свет напоўнены надзеямі і аптымізмам.

Вялікдзень — адно з самых светлых і радасных святаў у хрысціянскім календары, таму да яго заўсёды рыхтаваліся загадзя. Аднак самая інтэнсіўная падрыхтоўка прыпадае на апошні перадвелікодны тыдзень. Трэба паспець прыбраць у доме, каб усё зіхацела чысцінёй, прыгатаваць святочныя стравы і асвяціць іх у царкве.

Штогод мы прапаноўваем вам розныя рэцэпты гэтых традыцыйных велікодных страў. Сёння — не выключэнне.

ГАСПАДАР СТАЛА — ДУХМЯНЫ КУЛІЧ

Каб куліч быў смачным...

... малако, дрожджы, яйкі павінны быць вельмі свежымі, пшанічная мука — толькі вышэйшага гатунку, сухая і прасеяная праз сіта перад замешваннем цеста;

... цеста не павінна быць занадта вадкім, інакш куліч расплывецца і будзе плоскім; калі цеста будзе вельмі крутым, куліч атрымаецца цяжкім і хутка зачарсцвее;

...у памяшканні, дзе збіраецеся мясіць цеста, павінна быць цёпла і ціха;

...у даўніну лічылі, што цеста для куліча трэба «ўдарыць» 300 разоў, г.зн. вымешваць яго неабходна доўга і старанна;

...духоўку нагрэйце загадзя, каб цеста не пракісла;

...даставайце гатовы куліч не на стол, а на падушку, засланую старым настольнікам, а зверху новай сурвэткай.

...і прыгожым

Верх гатовага куліча можна абліць бялковым крэмам, цукровай глазурай і ўпрыгожыць цукатамі, арэхамі, фігуркамі з жэле, шакаладу ці мармеладу, а можна проста пасыпаць цукровай пудрай.

Бялковы крэм: 2 яечныя бялкі ўзбіце міксерам у пышную пену на працягу 10—15 хвілін. Невялікімі порцыямі дадайце 4 ст. лыжкі цукровай пудры, гатовы крэм павінен быць густым і добра трымацца на лыжцы. Для араматызацыі дадайце некалькі кропель лімоннага соку.

Цукровая глазура: у шклянку цукровай пудры ўліце 3 ст. лыжкі вады і нагрэйце да 90°, памешваючы. У такую глазуру дадайце харчовыя фарбавальнікі і араматызатары.

КУЛІЧ ЦАРСКІ

1,6 кг мукі, 100 г дражджэй, 500 г цукру, 150—200 г цукатаў, 200 г здрабленага міндалю, 500 мл малака, 8 яек, молаты кардамон, ванілін, 100 г манных круп.

Злёгку падагрэйце 300 г гатаванай вады, развядзіце ў ёй дрожджы, дадайце 250 г мукі, перамяшайце і пастаўце рошчыну ў цёплае месца, каб яна павялічылася ў аб'ёме.

Падагрэйце малако і змяшайце яго з мукой, якая засталася. Убіце 7 яек, пасыпце соллю і цукрам, злучыце з рошчынай, добра перамяшайце. Масла злёгку нагрэйце і злучыце з цестам. Пастаўце ў цёплае месца, каб аб'ём цеста павялічыўся ў два разы. Калі цеста падыдзе, яго трэба абмяць, затым дадайце цукаты, папярэдне абкачаўшы іх у муцэ, частку сечанага міндалю, кардамон і ванілін.

Нагрэйце духоўку да 180° . Форму змажце маслам, пасыпце манными крупамі і вылажыце ў яе цеста, каб яно займала не больш як адну трэцюю вышыні формы. Пастаўце на 30 хвілін у цёплае месца. Верх цеста змажце яйкам, пасыпце міндалем, пастаўце ў духоўку і выпякайце на працягу 40 хвілін.

-2400-

Ганаровае месца — для далікатнай пасхі

Каб пасха была смачнай...

...тварог павінен быць вельмі свежым, не горкім і не кіслым, а смятана і вяршкі — густымі;

...тварог лепш узяць сухі, у адваротным выпадку яго трэба адціснуць пад прэсам;

...цукар бярыце самы дробны, а яшчэ лепш — цукровую пудру;

...масу для пасхі неабходна старанна вымесіць, каб яна была гладкай і аднароднай (лепш працерці праз сіта);

...і прыгожай

Пасху можна пакінуць белай, гладкай, без упрыгажэнняў, а можна ўпрыгожыць. Напрыклад, цукатамі, разрэзаўшы іх на роўныя кубікі, разынкамі, арэхамі, каваличкамі мармеладу.

СЯЛЯНСКАЯ

1,5 кг тварагу (з адтопленага малака), 500 г масла, 3 яйкі, 500 г цукру, 0,5 пакеціка ванільнага цукру, 100—150 г разынак.

Прамыйце разынкі, абліце іх кіпнем і абсушыце на ручніку. Яйкі разатрыце з цукрам. Тварог прапусціце праз мясарубку, чаргуючы з маслам. Дадайце ванілін, яйкі з цукрам, усё старанна перамяшайце драўлянай лыжкай ці рукамі. Можна нават узбіць міксерам. Дадайце разынкі і яшчэ раз перамяшайце.

Калі тварог па колеру не вельмі жоўты, то можна дадаць у масу бляшанку варанага згушчанага малака, але тады трэба паменшыць норму цукру. Гатовую тварожную масу перакладзіце ў марлю (у два слаі) і памясціце ў форму (пасачніцу). Зверху пакладзіце цяжар і пастаўце ў халоднае месца.

ДАЛІКАТНАЯ

Разатрыце 200 г масла з 1 ст. лыжкай цукру дабяла, дадайце па аднаму 2—3 яечныя жаўткі. Масу расцірайце да поўнага раставання цукру (таму лепш узяць цукровую пудру), дадайце двойчы працёрты праз сіта тварог (500 г), 1 ст. лыжку прамытых разынак, 1 ст. лыжку здробненага міндалю (або іншых арэхаў), здробненую цэдру лімона і старанна перамяшайце.

Дадайце ўзбітыя вяршкі (0,5 шк.), перамяшайце зверху ўніз, запоўніце масай форму, засланую вільготнай марляй, накрыйце талеркай, пакладзіце цяжар і пастаўце ў халадзільнік.

ШАКАЛАДНАЯ

1 кг тварагу, 100 г шакаладу, 100 г цукровай пудры, 100 г масла, 1 шк. смятаны, 0,5 шк. цукатаў (або мармеладу).

Шакалад натрыце на буйной тарцы, змяшайце з цукровай пудрай. Тварог прапусціце праз сіта, змяшайце з маслам і смятанай, добра размяшайце. Дадайце змешаны з цукрам шакалад, нарэзаныя цукаты, старанна перамяшайце пры дапамозе міксера. Вылажыце ў форму, засланую тонкай ледзь вільготнай тканінай, накрыйце талеркай, пакладзіце цяжар, трымайце на холадзе суткі.

МЯДОВАЯ

700 г тварагу, 7 яечных жаўткоў, 100 г мёду, 30 г цукру, 200 г тлустай смятаны.

Тварог пратрыце праз сіта, дадайце 7 сырых жаўткоў, цукар, мёд, смятану. Старанна перамяшайце, перакладзіце масу ў форму, пастаўце пад прэс на холад.

Такая пасха мае ярка выражаны смак мёду, які цудоўна спалучаецца з тварагом.

-2401

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (28 сакавіка). Па гарызанталі: Змагар. «Космас». Шнур. Соль. Ляп. Сумо. Эрас. Тапаз. Нумаратар. Эму. Ордэн. Калумба. Пап. Біла. Дага. Грац. Зло. Эфа. Ікра. Мяса. Мост. Лаўка. Пыл. Сюіта. Жолуд. Траскун. **Па вертыкалі:** Ніка. Экіпаж. Манту. Мамалыга. Гурло. Рэмба. Распэ. Амбіцыя. Рытуал. Салат. Колба. Аноа. Строп. Ліса. Радзіма. Падпалкоўнік. Горск. «Свіцязянка». Атаман.

Кляшчы прачнуліся раней

36,6°

На месяц раней тэрміну сёлета актывізаваліся кляшчы. Прычына таму — надзвычай цёплае надвор'е, якое ўсталявалася. І вось ужо больш як дзесяць чалавек пацярпелі з-за пакусаў гэтых крывасмокаў.

Згодна з эпідэміялагічнай картай Беларусі, прыкладна на 85 працэнтаў яе тэрыторыі жывуць заражаныя кляшчы. Паводле слоў энтамолага Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святланы Яшковай, калі раней кляшчы «гаспадарылі» толькі ў лесе, то зараз яны перабіраюцца на дачныя і прысядзібныя ўчасткі, сустракаюцца і ў лесапаркавай зоне буйных гарадоў. Гэтыя паразіты — пераносчыкі больш чым 20 відаў захворванняў, сярод якіх клешчавы энцэфаліт і клешчавы барэліёз. Дарэчы, летась на клешчавы энцэфаліт захварэла 10 чалавек. Гэтыя людзі пілі сырое казінае малако. А яго трэба абавязкова кіпяціць.

Якія яшчэ правілы трэба ведаць, каб засцерагчы сябе ад пакусаў кляшчоў? Калі вы збіраецеся ў лес, абавязкова надзеньце галаўны ўбор і вопратку, якая б шчыльна прылягала да цела, з зашпіленымі манжэтамі на рукавах. Штаны павінны быць запраўленыя ў боты, або перацягнутыя ля шчыкалатак тасьмой ці гумкай. Неабходна таксама праз кожныя дзве гадзіны рабіць агляд адзення і адкрытых участкаў цела. Кляшчы бачныя няўзброеным вокам. Страсаць варта ўсіх насякомых, якіх вы знайшлі. Акрамя таго, калі вы аматар лясных букетаў ці займаецеся зборам лекавых раслін, абавязкова агледзьце гэтыя дарункі прыроды, ператрасіце іх, каб не прынесці ў дом заражаных паразітаў. Калі гулялі па лесе з сабакам, агледзьце і яго — кляшчы без цяжкасці могуць перапаўзці з поўсці жывёлы на чалавека ці на пасцельную бялізну, адзенне. Дарэчы, для свайго сабакі лепш набыць спецыяльны ашыйнік, апрацаваны сродкам для адпудзжвання насякомых.

Вольга ШАЎКО.

Выстаўкі

«Сэрцам да сэрца»

Так называецца выстаўка армянскага мастака Грыгора Данеляна, якая адкрылася ў мастацкай галерэі Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці (вул. Гікалы, 4). На выстаўцы прадстаўлены жывапісныя і графічныя творы аўтара. Выстаўка прысвячаецца Дням культуры Арменіі ў Беларусі.

Уладзя ТАЦЦЯНЧЫК.

Усміхнёмся!

☺

З дзённіка.

...

9.00 — Усё, больш не п'ю каву, не ем салодкага і не лаюся!

...

17.00 — Д'ябал! Цукерка ў каву ўпала!

☺

Учора зайшоў у магазін «Усё для футбола». Купіў там піва, цыгарэты і тэлевізар.

☺

Бог першым стварыў мужчыну, каб ён паспеў хоць што-небудзь сказаць.

☺

Сяброўка — сяброўцы:

— Была ва ўрача, аказалася — цяжарная.

— Прыдумала імя дзіцяці?

— Я яшчэ імя па бацьку абдумваю...

☺

Рабочыя гарадской кацельні ў выпадку нявыплаты заработнай платы пагражаюць працаваць усё лета.

☺

Рэцэпт прыгатавання яешні: — Ма-а-аша, я есці хачу!!!

☺

Навіны спорту. Працягваюць прыходзіць да фінішу ўдзельнікі спаборніцтваў па спартыўнаму арыентаванню-98.

☺

Калі муж прыйшоў дадому да таго, як зайграе па радыё Гімн у 6 раніцы, лічыцца, што ён начаваў дома.

— На слана мужыкі пайшлі...

Разам з птушкамі

У Беларусь прыляцелі першыя буслы, а Браслаўшчыну наведаў ружовы пелікан

Сёлета ў пачатку сакавіка да нас завітала даволі актыўная цёплая вясна, разам з якой у Беларусь пачалі вяртацца з зімовых «курортаў» родныя птушкі. Сёлета, як і раней, грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» арганізоўвае кампанію «Жывая вясна», калі разам з жыхарамі ўсёй Еўропы мы будзем назіраць за прылётам добравядомых і прыкметных птушак: вясковай ластаўкі, чорнага свіргуля, белага бусла і звычайнай зязюлі.

Паводле слоў спецыяліста па кампаніях і экалагічнай адукацыі АПБ Руслана Шайкіна, праект мае на мэце сабраць максімальныя звесткі аб тым, як мігруючыя птушкі вяртаюцца з зімовых «курортаў» родныя птушкі. Сёлета, як і раней, грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» арганізоўвае кампанію «Жывая вясна», калі разам з жыхарамі ўсёй Еўропы мы будзем назіраць за прылётам добравядомых і прыкметных птушак: вясковай ластаўкі, чорнага свіргуля, белага бусла і звычайнай зязюлі.

Паводле слоў спецыяліста па кампаніях і экалагічнай адукацыі АПБ Руслана Шайкіна, праект мае на мэце сабраць максімальныя звесткі аб тым, як мігруючыя птушкі вяртаюцца ў Еўропу. Даволі простыя назіранні, зробленыя вялікай колькасцю людзей, даюць відавочную карціну міграцыі птушак, паказваюць асноўныя рысы і змены ў іх характары, якія адбываюцца штогод.

Для таго, каб прыняць удзел у кампаніі «Жывая вясна» 2007 года і далучыцца да назіральнікаў за птушкамі, неабходна толькі заўважыць першых прыляцеўшых з выраю птушак абраных відаў і занесці свае назіранні на спецыяльны сайт www.springalive.net. Акрамя назвы віду і даты трэба занесці інфармацыю аб тым, у якой вобласці вы бачылі птушку, ваша імя і прозвішча, адрас і год нараджэння. Калі ў вас няма доступу да Інтэрнэта, неабходна патэлефанаваць ці напісаць пра свае назіранні ў офіс АПБ, тады супрацоўнікі офіса зместяць гэтую інфармацыю на сайце. Адрас АПБ: 220050 Мінск, п/с 306, вул. Макаёнка, д. 8, оф. 42, тэл.: (8-017) 263-01-30.

Ужо зараз вядома, што ў Беларусь паўсюдна прыляцелі палявыя жаўрукі і шпакі. У Мядзелі днямі бачылі каля дзесяці кнігавак, у Брэст прыляцелі качкі-шылахвосткі, ныркі-сівакі, вялікая коўра, розныя віды кулікоў; назіралася двухтысячная чарада залацістых севак. Ужо зараз першыя белыя буслы пачалі будаваць свае гнёзды ў Гродзенскай і Гомельскай абласцях. На мінулыя выхадныя ў Мачулішчах, што пад Мінскам, актыўна пачалі спяваць берасцянкі.

Даволі рэдкую з'яву назіраў навуковы супрацоўнік Нацыянальнага парку «Браслаўскія азёры» Віталь Кашчэеў. У сувязі з тым, што сёлетні сакавік стаў самым цёплым за мінулае дзесяцігоддзе, многія віды птушак прыбылі да месцаў размнажэння на два-тры тыдні раней за звычайныя тэрміны.

14 сакавіка супрацоўнікам парку пашчасціла назіраць ружовага пелікана ў Браслаўскім раёне каля вёскі Дрысвяты на мясцовым возеры сярод звычайных мігруючых і абарыгенных вадаплаўных птушак. Палёт пелікана і велізарную механізаваную дзюбу было цяжка пераблытаць з прыкметамі іншых вадаплаўных суседзяў. Зарослыя трысцягом

вадасховішчы Беларусі вельмі нагадваюць гэтай птушцы яе звычайныя месцы гнездавання — рачныя дэльты Каспійскага мора і азёраў Блізкага Усходу, паўднёвай Азіі і паўднёва-ўсходняй Афрыкі. Для нашай краіны ружовы пелікан — вельмі рэдкі, выпадкова залётны від. За апошнія дзесяць гадоў такіх сустрэч з гэтай птушкай у Беларусі арнітолагі не адзначалі. Тым не менш, гэтая паўднёвая птушка выпадкова залятала нават у рэгіён Санкт-Пецярбурга, на вадасховішчы Данii, Нарвегii і Швецыі.

Магчыма, гэта можна лічыць супадзеннем, але ў гэтых мясцінах, прыкладна каля 5 кіламетраў ад месца, дзе і быў зафіксаваны пелікан, ёсць аднайменная вёска і возера з назвай «Пеліканы». Ружовы пелікан, магчыма, стаў не зусім выпадковым пацвярджэннем даўніх назваў мясцовых мястэчак. Можа, у старажытныя часы ў Беларусі было яшчэ цяплей, чым зараз?

Па выніках папярэдняга года ў кампаніі «Жывая вясна» летась узялі ўдзел 2289 рэспандэнтаў па ўсёй Еўропе, якія зрабілі больш за 4000 назіранняў. Сярод абраных птушак найбольшая колькасць назіранняў прыпадае на белага бусла (34 працэнты), вясковую ластаўку (33 працэнты), звычайную зязюлю (18), чорнага свіргуля (15). Самым актыўным перыядам назіранняў летась стаў тыдзень з 27 сакавіка па 2 красавіка. Паважаныя сябры, далучайцеся да нас і назірайце прылёт птушак! Гэта вельмі прыгожа і цікава.

Сяргей КУРКАЧ.

Сёння

Сонца	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.46	19.43	12.57
Віцебск —	6.34	19.34	13.00
Магілёў —	6.36	19.33	12.57
Гомель —	6.34	19.28	12.54
Гродна —	7.02	19.58	12.56
Брэст —	7.04	19.57	12.53

Месяц

Поўня 2 красавіка
Месяц у сузор'і Дзевы

Імяніны

Пр. *Кірылы, Трафіма*
К. *Альбіны, Карнелії, Беньяміна*

Надвор'е на заўтра



Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

...у суседзяў

ВАРШАВА	+14 — +16 °C	МАСКВА	+8 — +10 °C
ВІЛЬНЮС	+10 — +12 °C	РЫГА	+9 — +11 °C
КІЕЎ	+12 — +14 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+7 — +9 °C

Без ападкаў

31 сакавіка

Дзве даты

1889 год — у Парыжы адбылося адкрыццё Эйфелевай вежы.

1901 год — выпушчаны першы аўтамабіль «Мерседэс». Першы экземпляр быў выкананы ў выглядзе двухмеснай гоначнай машыны. Машына была названа Mercedes у гонар дачкі аднаго з саўладальнікаў аўтамабільнай кампаніі — аўстрыйскага прадпрымальніка, дыпламата і аўтагоншчыка Эміля Елінека.

Цытата дня:

«Калі нам дрэнна, мы заўсёды думаем: «А вось камусьці зараз вельмі добра». Калі нам добра, мы рэдка думаем: «Камусьці зараз вельмі дрэнна».

Васіль Шукшын (1929—1974), рускі пісьменнік, кінарэжысёр, акцёр.

Дарагога мужа, любага татачку ***Аляксея Іванавіча ВЯЛІЧКУ*** *віншуем з днём нараджэння. Жадаем здароўя, поспехаў у працы, добрых сяброў, кахання і шчасця ў жыцці.*

Таццяна, Кірыл, в. Выганічы.

БЕЛАРУСБАНК

УТВЕРЖДЕНО
Наблюдательный совет
АСБ «Беларусбанк»
20 марта 2007 г.
Протокол № 5

ЗАВЕРЯЮ
Начальник Управления ценных бумаг
Главного управления
по г. Минску Министерства финансов
Республики Беларусь
В.Н. Омельянович
29 марта 2007 г.

Изменение в краткую информацию
об открытой продаже облигаций двадцать первого
и двадцать второго выпусков открытого акционерного
Общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»

Часть шестнадцатую изложить в следующей редакции: «Срок первичной продажи облигаций 21 выпуска: **с 1 февраля 2007 года по 30 апреля 2007 года** включительно».

Председатель Правления
АСБ «Беларусбанк» Н.А. Ермакова
Главный бухгалтер АСБ «Беларусбанк» И.П. Лысовская

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

У Ракаў настае самы рамантычны перыяд, а Дзеваў чакаюць выгадныя прапановы



Авен. Дзелавая паездка можа адкрыць перад вамі новыя перспектывы. Ёсць шанц, што ўдача ўсміхнецца вам. Таксама магчымы і абсалютна заканамерны ўзлёт у кар'еры. Рызыкоўныя прадпрыемствы завершацца паспяхова ў тым выпадку, калі вы правільна разлічыце свае сілы і не будзеце ўскладаць вялікія надзеі на чыюсьці дапамогу. Не адхіляйце ўвагу, рабіце сваю справу — і дайце іншым магчымасць займацца сваімі пытаннямі. Зараз неабходна працаваць на бліжэйшую будучыню. У пятніцу ці суботу верагодна перспектыўнае знаёмства.

Цялец. Тыдзень пройдзе ў спакойным тэмпе: калі, канешне, вы па асабістай ініцыятыве не будзеце ствараць сабе лішнія праблемы. Пастарайцеся рэальна разлічваць свае сілы і не ўзвальваць на сябе дадатковую працу і абавязацельствы, якія абцяжарваюць. Дасціпнасць дазволіць убачыць сітуацыю, якая склалася, з іншага боку і знайсці арыгінальны спосаб вырашэння ўсіх пытанняў.

Блізняты. Тыдзень складаны і непрадказальны. Давядзецца набрацца мудрасці і цярпення, каб пераадольваць складанасці, якія ўзнікаюць. Настае час выканання даўніх абяцанняў: пастарайцеся зрабіць гэта, каб не пакрыўдзіць каго-небудзь ненарокам. У панядзелак добра будаваць планы на бліжэйшую будучыню, але ўсе думкі наконт гэтага лепш пакуль захоўваць у тайне. У аўторак пажадана не пачынаць нічога новага. Серада небяспечная канфліктамі з начальствам. Пачынаючы з чацвярга сітуацыя зменіцца ў лепшы бок. Не забывайцеся на хатнія справы і праблемы, якіх назапасілася: яны чакаюць свайго вырашэння.

Рак. Лёс можа падкідваць задачы, для рашэння якіх спатрэбіцца інтуіцыя і здольнасць да аналізу. У панядзелак будзьце больш асцярожныя — у пагоні за выгадай можна праваронціць перспектыўны доўгатэрміновы кантракт. У сераду будзьце больш акуратныя з лічбамі і дакладнымі разлікамі. Пачынаючы з чацвярга перад вамі могуць адкрыцца цудоўныя перспектывы. Гэта спрыяльны час для вучобы і кар'еры. У нядзелю можа пачацца адзін з самых рамантычных перыядаў — адчуйце асалоду ад гарманічнай атмасферы.

Леў. На працы вас можа чакаць удача. У многіх справах будзеце проста незамянімым чалавекам. Важна правільна спланаваць справы на гэты тыдзень, каб не перарасходаваць свае сілы. Адчуўшы прыліў энергіі, не варта хапацца за некалькі спраў адразу — лепш спыніцца на чым-небудзь адным, найбольш значным для вас. У пятніцу для рэалізацыі планаў спатрэбіцца старанная падрыхтоўка. Прысвяціце выхадныя сямейным справам і дзецям: ім неабходны інтэнсіўныя зносіны з вамі.

Дзева. Тыдзень поўны рознымі падзеямі, сумаваць не давядзецца. У прафесійнай сферы будзе забяспечана стабільнасць і дабрабыт, калі не будзеце ленавацца. Тыдзень цудоўна падыдзе для ажыццяўлення доўгачаканых праектаў і планаў. Могуць паступіць выгадныя прапановы, якія вельмі парадуюць вас. Чым больш свядомымі будуць дзеянні, тым лепшым акажацца вынік.

Шалі. Успомніце пра старых сяброў: запрасіце іх у госці ці хоць бы патэлефануйце. Панядзелак можа прайсці ў стане эйфарыі, але ўжо ў аўторак вам давядзецца спускацца з нябёс на зямлю. Пажадана прывесці на працоўе ў ідэальны парадак усю дакументацыю — і вы адчуеце ўнутраную лёгкасць і душэўную раўнавагу. У сераду ад начальства лепш трымацца далей: яго можа раздражняць ваша актыўнасць і ініцыятыўнасць. У другой палове тыдня сітуацыя зменіцца, ваша асабістая прывабліваць дапаможа прасунуцца па службовай лесвіцы. Добры час для аднаўлення згубленых сувязяў і кантактаў. Дзеці парадуюць новымі дасягненнямі.

Скарпіён. На службе пачынаюцца важныя і спрыяльныя для вас падзеі: маеце ўсе шанцы вызначыцца, атрымаць павышэнне ці знайсці новую прэстыжную работу. Аднак неабходна мець мужнасць прызнацца сабе і начальству ў тым, што вы ўмееце, а чаго не ўмееце рабіць, бо спадзявацца на чыюсьці дапамогу не давядзецца. У аўторак можаце сутыкнуцца з інтрыгамі калег ці з нядобразычлівымі адносінамі навакольных.

Стралец. Зможаце дастаткова лёгка справіцца са справамі — незалежна ад іх характару. З'явіцца магчымасць перагледзець свой статут і яшчэ раз абмеркаваць гэта з зацікаўленымі людзьмі, але тут спатрэбяцца намаганні. У панядзелак магчымыя цікавыя прапановы, якім неабходны нестандартныя рашэнні і пазбаўленне ад некаторых звычак. У другой палове тыдня давядзецца браць на сябе адказнасць за прыняцце неабходных рашэнняў, якія паўплываюць на бліжэйшую будучыню. У суботу вашы ідэі адкрыюць прамы шлях да поспеху, і вы будзеце задаволены сітуацыяй, якая склалася.

Казярог. Давядзецца шмат часу надаць вырашэнню асабістых праблем. Партнёры па бізнэсу могуць прычыніць клопаты. Прыслухайцеся да парад сяброў — магчыма, гэта яшчэ адзін стымул да поспеху. Работы можа быць значна больш, чым разлічвалі. Карысна будзе заняцца пашырэннем кола зносінаў. Скарыстайце прафесійны вопыт калег — і даведаецеся шмат новага і цікавага для сябе. У панядзелак магчыма дзелавая і канструктыўная сустрэча з партнёрамі. Начальства ў гэты дзень будзе прыслухоўвацца да вашага меркавання. У сераду давядзецца адстойваць перад калегамі вашы задумы. У чацвер, па магчымасці, адпачніце на свежым паветры. Звярніце ўвагу на праблемы дзяцей: ім патрэбны клопат і дапамога.

Вадалей. Больш уважліва сачыце за тым, што і каму вы гаворыце. Інакш, не выключана, што можаце стаць ахвярай падману. Добры час для ад'езду на мора — з мэтай адпачынку, зразумела. У першай палове тыдня варта канцэнтраваць свой эмацыянальны стан, каб не трапіць у няёмкае становішча. Аўторак можа аказацца днём нечаканых сустрэч і важных, каб не сказаць — лёсавызначальных, знаёмстваў. Паездку і справы, запланаваныя на пятніцу, лепш адкласці ці перанесці на наступны тыдзень. У выхадныя дні вашы творчыя праекты будуць падтрыманы, але калі даражыце поспехам — пастарайцеся не адцягваць увагі.

Рыбы. У панядзелак падвядзіце вынікі і прааналізуйце падзеі. Серада — удалы дзень для раскрыцця здольнасцяў. У чацвер увесь дзень вам будзе спадарожнічаць добры настрой: можна смела ажыццяўляць самыя авантурныя планы, не баючыся ўскладненняў. У суботу будзьце больш асцярожнымі, не верце лісліўым словам і ўступчывасці — хутчэй за ўсё, гэта гульня. У выхадныя можаце стаць цэнтрам агульнай увагі і душой кампаніі.

Работа в теплице (в Польше)

Наш адрес:
Огородное хозяйство
Janów 14, 05-480 Karczew,
Polska / Польша.

Тел. для контактов:
+48-668-136-776
E-mail:info@tomatojtm.pl
Факс: +48-22-780-84-08.

Работаем через агентства Беларуси соответствующего профиля, имеющие необходимые разрешения и лицензии.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 1775. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12